07/12 9

5.VI.51.

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі, Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР, Міністэрства кінематаграфіі БССР і Камітэта па справах культурна- асветных устаноў пры Совеце Міністраў БССР

№ 6 (653) | Субота, 7 лютага 1948 года. | Цана 50 кап.

Да схода пісьменнікаў

Мы знаходзімся напярэдадні ўсебеларускага схода совецкіх пісьменнікаў.

Прайшло больш за поўгода з часу, калі Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі прыняў пастанову аб рабоце Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Гэтая пастанова, адзначыўшы творчыя поспехі беларускай совецкай літаратуры ў пасляваенныя гады, разам з тым ускрыла буйнейшыя хібы як у арганізацыйнай, так і ў творчай рабоце Саюза.

У ёй было сказана, што «Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР яшчэ не дасягнуў карэннага пералому ў сваёй рабоце, не зрабіў усіх неабходных вывадаў з пастановы ЦК ВКП(б) аб часопісах «Звязда» і «Ленінград». У пасляваенны перыяд пісьменнікі яшчэ не напісалі значных твораў аб важнейшых падзеях сучаснага жыцця беларускага народа».

ЦК КП(б)Б дапамог дзеячам беларускай літаратуры глыбей усведаміць гістарычны сэнс мудрых рашэнняў ЦК ВКП(б) аб літаратуры і мастацтве і даклад тав. Жданава аб часопісах «Звязда» і «Ленінград».

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б нацэліў беларускую пісьменніцкую арганізацыю на паварот да сучаснай тэмы, на адлюстраванне гераічнага подзвіга нашага народа ў дні Айчыннай вайны і ў час мірнай стваральнай працы.

Як-жа Саюз совецкіх пісьменнікаў Беларусі, як нашы пісьменнікі выпраўлялі буйнейшыя хібы, адзначаныя ў іх рабоце, наколькі актыўна яны ўключаліся ў наша соцыялістычнае сёння, як уздымалі ідэйна-мастацкі ўзровень твораў?

Трэба адзначыць, што рашэнні партыі адыгралі выключна вялікую ролю ў жыцці беларускай пісьменніцкай арганізацыі. Пачала разгортвацца крытыка і самакрытыка. Саюз пісьменнікаў рашуча і правільна раскрытыкаваў апалітычныя і нізкаякасныя творы, якія з'явіліся з-пад пяра асобных літаратараў.

За час пасля ліпеньскай пастановы ЦК КП(б) Беларусі адбыліся пэўныя дадатныя зрухі ва ўсіх жанрах беларускай совецкай літаратуры.

Тут трэба ў першую чаргу адзначыць творчую актывізацыю нашых празаікаў. Алесь Стаховіч надрукаваў раман «Пад мірным небам», Макар Паслядовіч — аповесць «Цёплае дыханне», Тарас Хадкевіч— аповесці «Братэрства» і «Вяснянка», малады празаік Іван Шамякін—першую частку аповесці «Глыбокая плынь», Янка Брыль — кнігу апавяданняў. Ужо з'яўляюцца дакументальныя творы, прысвечаныя дзейнасці выдатных беларускіх партызан, — «Рыгор Шыбай» Ус. Краўчанкі, і інш. Аднак, мы не памылімся, калі скажам, што колькасны рост нашай прозы не заўсёды суправаджаецца якасным яе ростам. Некаторыя творы прозы хварэюць на схематызм, у іх няма глыбокай тыпізацыі і абагульнення.

Што-ж датычыць твораў маладых пісьменнікаў, дык галоўныя іх хібы—няўменне валодаць мастацка-выяўленчымі сродкамі, маляваць характары, а ў некаторых — і беднасць мовы.

Да гэтага часу ў нас не з'явіліся яшчэ выдатныя творы, якія-б абагульнялі вопыт барацьбы беларускага народа ў часы Айчыннай вайны, а таксама вопыт яго гераічнай аднаўленчай работы.

Нашы паэты за апошні час напісалі рад новых цікавых паэм, выйшла некалькі змястоўных зборнікаў паэзіі.

У гэтых творах адлюстраваны высокародныя ідэі совецкага патрыятызма, совецкая нацыянальная гордасць, услаўляецца веліч подзвігаў совецкіх людзей. Аднак, мала з'явілася ў нас вялікіх паэтычных твораў аб сённешнім жыцці совецкага народа.

Трэба спадзявацца, што сход пісьменнікаў Беларусі дасць правільную ацэнку сучаснага становішча беларускай совецкай паэзіі, дапаможа мабілізацыі выдатных майстроў паэтычнага жанра на далейшае паглыбленне праблематыкі іх твораў, на актыўнае ўключэнне іх у працэсы соцыялістычнага будаўніцтва.

Найбольш колькасны рост за час пасля пастановы ЦК КП(б) Беларусі мы мелі ў галіне драматургіі. З'явілася каля 10 новых п'ес, рознастайных па тэмах: партызанскі рух, пасляваеннае аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі, будаўніцтва гарадоў, паказ змагання новага са старым у нашай рэчаіснасці. Праўда, сярод гэтых п'ес мы не сустракаем ужо цалкам завершаных твораў. Але большасць з іх, пры пэўных пераробках і ўдасканаленні, можа быць пастаўлена ў прафесіянальных тэатрах. Аднак, тут мы сустракаемся з інертнасцю Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР і некаторых тэатраў, якія слаба працуюць з драматургамі. Кіраўнікі ўстановамі мастацтва, а таксама нашы тэатры павінны імкнуцца да таго, каб кожная вартая сучасная беларуская п'еса ўбачыла сцэну.

Галоўнейшай умовай далейшага ўздыму беларускай совецкай драматургіі з'явіцца большая глыбіня ў адлюстраванні рэчаіснасці, паказ яскравых і тыповых вобразаў нашага сёння, поўнае авалоданне драматургамі законамі тэатра.

У пастанове ЦК КП(б)Б было сказана, што «ў нашых літаратурных арганізацыях, газетах і часопісах яшчэ не разгорнута прынцыповая, вострая і аб'ектыўная крытыка».

Беларускія совецкія крытыкі за апошні час выступілі з асобнымі артыкуламі, накіраванымі супроць перажыткаў нацыяналізма і нізкапаклонства перад буржуазным захадам, імі разгортваецца значная работа па ацэнцы на аснове марксісцка-ленінскага вучэння літаратурнай спадчыны і асноўных этапаў гісторыі беларускай літаратуры.

Аднак, нашы крытыкі вядуць яшчэ недастатковую барацьбу, супроць уплываў варожай ідэалогіі. Няўменне разабрацца ў класавай барацьбе, якая адбывалася ў беларускай літаратуры і з'яўлялася адлюстраваннем барацьбы ў самой рэчаіснасці, нежаданне высветліць супярэчнасці светапогляду дэмакратычных пісьменнікаў, ліберальнае стаўленне да іх памылак і зрываў, — вось што характэрна для некаторых крытыкаў.

Асноўная задача беларускага совецкага літаратуразнаўства і крытыкі заключаецца ў паслядоўнай барацьбе супроць усіх ідэйна-варожых скажэнняў як у літаратурнай навуцы, так і ў творах пісьменнікаў. Крытыкі павінны ўзмацніць работу па стварэнню даступнага шырокаму чытачу і адпавядаючага вучэнню Леніна—Сталіна падручніка па гісторыі беларускай літаратуры.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ўказваў на тое, што «вельмі слаба развіваецца беларуская дзіцячая літаратура».

Трэба адзначыць, што ні Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, ні самі нешматлікія кадры дзіцячых пісьменнікаў не зрабілі для сябе адпаведных вывадаў з гэтых указанняў, да канца не зразумелі велізарнейшае ідэйнае значэнне мастацкага слова ў выхаванні падрастаючага пакалення. За апошні час у нас вельмі мала з'явілася новых твораў для дзяцей.

Скліканая ЦК ЛКСМБ канферэнцыя дзіцячых пісьменнікаў абмеркавала надзённыя пытанні развіцця дзіцячай літаратуры ў Беларусі. Трэба спадзявацца, што гэтая канферэнцыя паслужыць штуршком і зрушыць справу з месца.

Многія буйнейшыя хібы беларускай совецкай літаратуры тлумачацца, у прыватнасці, слабай ідэйна-творчай работай Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі і яго секцый. Цяпер зменены метады кіраўніцтва ў Саюзе. Выбраны сакратарыят, які галоўную ўвагу павінен звярнуць на дапамогу пісьменнікам у іх творчасці, на ідэйна-выхаваўчую работу сярод іх.

Наш совецкі народ кожны дзень адзначае працоўнымі подзвігамі так, як ён адзначаў яго ратнымі подзвігамі ў дні Айчыннай вайны. Гераічнымі намаганнямі беларускага народа аднаўляецца разбураная гаспадарка, культурныя і асветныя ўстановы рэспублікі. Будуюцца новыя заводы-гіганты, ліквідуюцца апошнія зямлянкі, (усяго ў нова-пабудаваныя дамы ўселена 1.800.000 чалавек), ідзе змаганне за новы ўраджай.

Усё гэта, як і гераічная барацьба нашага народа ў дні Айчыннай вайны, павінна стаць тэмаю нашых будучых кніг.

Беларускія совецкія пісьменнікі ў 1948 годзе яшчэ больш уздымуць сваю творчую актыўнасць, напружаць свае сілы для ўвасаблення ў жыцці гістарычных пастаноў ЦК ВКП(б) аб літаратуры і мастацтве, для выканання задач, высунутых у дакладзе таварыша Жданава аб часопісах «Звязда» і «Ленінград».

„Маніфест Комуністычнай партыі" на беларускай мове

У лютым спаўняецца 100 год з дня апублікавання «Маніфеста Комуністычнай партыі». За гэты час «Маніфест Комуністычнай партыі» перакладаўся і быў выдадзены амаль ва ўсіх краінах свету. Праграмны дакумент пролетарскай рэвалюцыі 220 разоў выдаваўся ў Совецкім Саюзе.

Да Вялікай Айчыннай вайны «Маніфест Комуністычнай партыі» шэсць разоў выходзіў на беларускай мове. Гэтымі днямі Дзяржаўнае Выдавецтва БССР выпусціла ў свет на беларускай мове сёмае выданне «Маніфеста Комуністычнай партыі». Тыраж выдання — 20 тысяч экземпляраў.

ПАСЕДЖАННІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

30 студзеня ў Маскве, у вялікай залі Крэмлёўскага палаца, адкрылася IV сесія Вярхоўнага Совета СССР.

У 2 гадзіны дня адбылося паседжанне Совета Саюза, у 4 гадзіны — паседжанне Совета Нацыянальнасцяў.

Пасля даклада мандатнай камісіі аднагалосна зацвярджаецца наступны парадак дня сесіі:

1. Зацверджанне Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1948 год і справаздача аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1946 год.

Пытанне ўносіцца Советам Міністраў СССР.

2. Зацверджанне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Пытанне ўносіцца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.

Прымаецца наступны парадак разгляду пытанняў: даклад аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1948 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1946 год заслухаць на сумесным паседжанні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцяў, а судаклады бюджэтных камісій, абмеркаванне бюджэту і яго зацверджанне правесці раздзельна па палатах; зацверджанне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР правесці раздзельна па палатах.

* * *

31 студзеня, у 7 гадзін вечара, у Вялікім Крэмлёўскім палацы адбылося сумеснае паседжанне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцяў.

З'яўленне ва ўрадавых ложах таварыша І. В. Сталіна, т. т. В. М. Молатава, А. А. Жданава, Л. П. Берыя, К. Я. Варашылава, А. І. Мікаяна, Л. М. Кагановіча, Г. М. Маленкова, Н. А. Вазнясенскага, Н. М. Шверніка, А. Н. Касыгіна, Н. А. Булганіна, А. А. Кузняцова, М. А Суслава, Г. М. Папова сустракаецца дэпутатамі і гасцямі бурнай авацыяй у гонар Вялікага Сталіна і яго верных саратнікаў, кіраўнікоў партыі і ўрада.

Старшыня Совета Саюза І. А. Парфёнаў прадстаўляе слова для даклада аб Дзяржаўным бюджэце на 1948 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту за 1946 год Міністру фінансаў СССР А. Г. Звераву.

Дакладчык адзначае, што план першых двух год пяцігодкі па валавай прадукцыі прамысловасці выкананы поўнасцю.

Дзякуючы паспяховаму правядзенню ў жыццё рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і самаадданай працы калгаснікаў наша сельская гаспадарка, пераадольваючы цяжкасці пасляваеннага перыяда, паглыбленыя засухай 1946 года, упэўнена рухаецца наперад. У параўнанні з 1946 годам валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў 1947 годзе павялічылася на 32 процанты.

Дзяржаўны бюджэт у мінулым годзе выкананы з перавышэннем прыбыткаў над выдаткамі на 24 мільярды рублёў.

Важнейшай падзеяй 1947 года было правядзенне грашовай рэформы і адмена картачнай сістэмы, якія накіраваны на далейшае ўмацаванне эканамічнай магутнасці совецкай дзяржавы і палепшанне добрабыту працоўных.

Далей дакладчык характарызуе выкананне Дзяржаўнага бюджэту за 1946 год, паведамляе папярэднія вынікі выканання бюджэту за 1947 год і дакладвае праект Дзяржаўнага бюджэту на 1948 год, які прадстаўлены на зацверджанне Вярхоўнага Совета СССР.

Заключныя словы дакладчыка, у якіх тав. Звераў выказвае ўпэўненасць у тым, што совецкі народ прыкладзе ўсе свае сілы да паспяховага выканання Дзяржаўнага бюджэту на 1948 год і дасягне пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў і таварыша Сталіна новых перамог, сустракаюцца бурнымі, доўга не змаўкальнымі апладысментамі.

Усе ўстаюць і наладжваюць гарачую авацыю ў гонар вялікага правадыра совецкага народа таварыша Сталіна.

* * *

2 лютага, у 11 гадзін раніцы, у залі паседжанняў Вярхоўнага Совета СССР адбылося паседжанне Совета Нацыяальнасцяў.

Совет Нацыянальнасцяў заслухаў судаклад Старшыні бюджэтнай камісіі Совета Нацыянальнасцяў дэпутата Хахлова І. С.

Пасля судаклада бюджэтнай камісіі адкрылася спрэчкі па першаму пункту парадку дня.

2 лютага, у 6 гадзін вечара, у залі паседжанняў Вярхоўнага Совета СССР адбылося паседжанне Совета Саюза.

Совет Саюза заслухаў судаклад Старшыні бюджэтнай камісіі Совета Саюза дэпутата Карнійца Л. Р.

Затым адкрылася спрэчкі па першаму пункту парадку дня.

* * *

3 лютага на паседжаннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцяў адбываліся спрэчкі па першаму пункту парадка дня.

4 лютага, у 11 гадзін, адбылося паседжанне Совета Нацыянальнасцяў, а ў 6 гадзін вечара — паседжанне Совета Саюза.

На паседжаннях працягваліся спрэчкі па дакладу аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1948 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту за 1947 год.

Пасля заканчэння спрэчак Совет Нацыянальнасцяў, а затым і Совет Саюза заслухалі заключнае слова Міністра фінансаў СССР дэпутата **Зверава А. Г.**

Совет Нацыянальнасцяў і Совет Саюза аднагалосна зацвярджаюць Дзяржаўны бюджэт СССР на 1948 год. Па артыкулах, а затым і цалкам аднагалосна зацвярджаецца «Закон аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1948 год».

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў разглядаюць апошні пункт парадку дня—зацверджанне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР дэпутат **Горкін А. Ф.**

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў аднагалосна зацвярджаюць Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб пераўтварэнні Міністэрства аўтамабільнай прамысловасці СССР у Міністэрства аўтамабільнай і трактарнай прамысловасці СССР», «Аб утварэнні Міністэрства лясной гаспадаркі СССР», «Аб перайменаванні Айроцкай аўтаномнай вобласці Алтайскага краю» і прымаюць пастанову ўнесці адпаведныя змены і дадаткі ў артыкулы 22, 77, 78 Канстытуцыі СССР.

Далей Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў зацвярджаюць Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР:

Аб прызначэнні тав. Булганіна Нікалая Аляксандравіча Намеснікам Старшыні Совета Міністраў СССР»;

«Аб прызначэнні тав. **Кагановіча Лазара Майсеевіча** Намеснікам Старшыні Совета Міністраў СССР»;

«Аб прызначэнні тав. **Малышава Вечаслава Аляксандравіча** Намеснікам Старшыні Совета Міністраў СССР».

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў. зацвярджаюць Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб прызначэнні Міністраў СССР:

Міністрам Узброеных Сіл СССР — **Булганіна Нікалая Аляксандравіча;**

Міністрам прамысловасці будаўнічых матэрыялаў СССР — **Гінзбурга Сямёна Захаравіча;**

Міністрам лясной прамысловасці СССР — **Арлова Георгія Міхайлавіча;**

Міністрам лясной гаспадаркі СССР — **Матавілава Германа Пятровіча;**

Міністрам прамысловасці сродкаў сувязі СССР — **Аляксеенку Генадзія Васільевіча;**

Міністрам лёгкай прамысловасці СССР— **Часнакова Нікалая Ермалаевіча;**

Міністрам будаўніцтва ваенных і ваенна-марскіх прадпрыемстваў СССР— **Дыгая Нікалая Аляксандравіча;**

Міністрам аўтамабільнай і трактарнай прамысловасці СССР — **Акопава Сцяпана Акопавіча;**

Міністрам цэлюлёзнай і папяровай прамысловасці СССР — **Грачова Леаніда Паўлавіча;**

Міністрам транспартнага машынабудаўніцтва СССР—**Насенку Івана Ісідаравіча;**

Міністрам юстыцыі СССР — **Гаршэніна Канстанціна Пятровіча.**

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў. зацвердзіў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб прызначэнні тав. **Лебедзева Палікарпа Іванавіча** Старшынёй Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў СССР.

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў. прымаюць пастанову аб вызваленні тав. **Гаршэніна Канстанціна Пятровіча** ад абавязкаў Генеральнага Пракурора СССР, у сувязі з пераходам на іншую работу.

Затым Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў зацвярджаюць Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб забароне шлюбу паміж грамадзянамі СССР і іншаземцамі», «Аб адмене смяротнай кары», «Аб узмацненні аховы асабістай уласнасці грамадзян», «Аб крымінальнай адказнасці за раскраданне дзяржаўнай і грамадскай маёмасці», «Аб адказнасці за выдачу дзяржаўнай тайны і за страту дакументаў, якія маюць дзяржаўную тайну».

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў. аднагалосна прымаюць пастанову:

«Прызначыць Генеральным Пракурорам СССР тав. **Сафонава Грыгорыя Нікалаевіча».**

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў. аднагалосна выбіраюць Намеснікамі Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР:

Тав. **Власава Івана Аляксеевіча,**

Тав. **Пяль Эдуарда Нікалаевіча;**

Тав. Керымбаева Даніяла.

Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцяў пастанавілі вызваліць тав. **Казакпаева Абдзісамета** ад абавязкаў Намесніка Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Парадак дня вычарпаны. 4 сесія Вярхоўнага Совета СССР закончыла сваю работу.

Творы аб Совецкай Арміі

Сакратарыят Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР зацвердзіў мерапрыемствы па ўдзелу пісьменнікаў Беларусі ў падрыхтоўцы да 30-годдзя Совецкай Арміі. Сакратарыят звярнуў увагу паэтаў і празаікаў на стварэнне новых вершаў, апавяданняў, нарысаў, прысвечаных жыццю, баявой дзейнасці і вучобе воінаў Совецкай Арміі. Крытыкам У. Карпаву, У. Агіевічу, А. Кучару, М. Ларчанку і С. Майхровічу даручана напісаць для перыядычнага друку артыкулы на тэму «Совецкая Армія і партызанскі рух у творчасці беларускіх пісьменнікаў».

У часопісах «Полымя», «Беларусь» і ў газеце «Літаратура і мастацтва» будзе адзначана слаўнае трыццацігоддзе надрукаваннем новых твораў беларускіх пісьменнікаў пра гераізм і мужнасць Совецкай Арміі.

Бюро прапаганды Саюза сумесна з Акруговым Домам афіцэраў Совецкай Арміі наладжвае некалькі літаратурных вечароў для грамадскасці сталіцы і воінскіх часцей. На гэтых вечарах выступяць паэты і празаікі Мінска, члены секцыі рускай літаратуры Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

У абласных цэнтрах рэспублікі выступяць маладыя пісьменнікі, члены літаб'яднанняў.

Новыя песні

Набліжаецца слаўная дата 30-годдзя Совецкай Арміі. Існуе добрая традыцыя трымаць шчыльную сувязь паміж работнікамі мастацтва і творчымі работнікамі Совецкай Арміі. Асабліва яскрава выявілася гэтая сувязь у дні Вялікай Айчыннай вайны.

Кампазітары Беларусі рыхтуюцца сустрэць знамянальную дату заснавання роднай Совецкай Арміі новымі творамі. На паседжанні Праўлення Саюза кампазітараў быў прыняты рад абавязацельстваў па стварэнню твораў, прысвечаных юбілею. Акрамя раней напісаных, рыхтуюцца новыя творы, спецыяльна прыўрочаныя да вялікай даты. Так, кампазітар М. Чуркін закончыў для духавога аркестра марш і сюіту, выкананне апошняй разлічана на сілы ваеннага аркестра. Кампазітар Алоўнікаў рыхтуе паходныя песні.

Акрамя новых твораў, кампазітары Беларусі ўзялі на сябе абавязацельства актыўна ўключыцца ў трохмесячнік шэфскай работы. Будуць праведзены два-тры канцэрты-гутаркі; у часцях Совецкай Арміі аказана дапамога гурткам мастацкай самадзейнасці. Галоўная ўвага будзе накіравана на выяўленне і дапамогу пачынаючым кампазітарам—воінам.

Можна з упэўненасцю сказаць, што кампазітары Беларусі варта адзначаць гадавіну Совецкай Арміі.

Д. КАМІНСКІ,
адказны сакратар Саюза совецкіх кампазітараў БССР.

Студыя малюнка

Паводле рашэння Гаркома профсаюза Совецкіх мастакоў БССР, пры Акруговым Доме Афіцэраў арганізуецца студыя малюнка. Перад беларускімі мастакамі, якія будуць працаваць у студыі, стаіць задача—стварыць вобразы гераічных салдат і афіцэраў Совецкай Арміі. Лепшыя партрэты-малюнкі будуць прадстаўлены на выстаўцы, прысвечанай 30-годдзю Совецкай Арміі.

Для арганізацыі кансультацый байцоў, мастакоў-самавучак вылучаны Л. Кроль.

Бюджэт 1948 года

Чацвертая сесія Вярхоўнага Совета Саюза ССР прыняла закон аб Дзяржаўным бюджэце на 1948 год. У новым Дзяржаўным бюджэце знаходзяць сваё найярчэйшае адлюстраванне няспынныя клопаты партыі і ўрада аб росце магутнасці нашай дзяржавы, культурным і матэрыяльным уздыме народаў вялікага Совецкага Саюза.

На бязмежных прасторах нашай Радзімы разгарнулася вялікае пасляваеннае будаўніцтва. Адзін за другім уступаюць у строй разбураныя вайной заводы і фабрыкі, шахты і электрастанцыі, ачышчаюцца ад руін і ўпрыгожваюцца новымі будынкамі гарады, вырастаюць новыя калгасныя вёскі, аднаўляецца правільны севазварот. Гул сотняў тысяч самых рознастайных машын у горадзе і вёсцы радуе сэрца совецкага чалавека, выклікае ў яго пачуццё бязмежнай гордасці за сваю магутную соцыялістычную Радзіму. Жыццездольнасць совецкага грамадскага, палітычнага і дзяржаўнага ладу, якая была прадэманстравана перад усім светам у дні мінулай вайны, у пасляваенныя часы выявілася з новай сілай у гіганцкім пафасе будаўніцтва, у соцыялістычным спаборніцтве за выкананне пяцігодкі ў чатыры гады, у той найвялікшай творчай дзейнасці совецкага народа, дзякуючы якой наша краіна паспяхова залечвае раны, нанесеныя вайной, і ажыццяўляе далейшае соцыялістычнае будаўніцтва.

Поспехі ў аднаўленні народнай гаспадаркі, рост эканамічнай магутнасці нашай Радзімы далі магчымасць совецкаму ўраду адмяніць картачную сістэму забеспячэння, ажыццявіць грашовую рэформу і тым самым значна палепшыць матэрыяльны добрабыт працоўных.

Міністр фінансаў СССР тав. Звераў у сваім дакладзе аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1948 год і выкананні бюджэту за 1946 год даў падрабязны аналіз поспехаў совецкага народа ў выкананні планаў першых год новай сталінскай пяцігодкі і ад імя ўрада прапанаваў фінансавую праграму дзяржавы на 1948 год, праграму далейшага росту эканамічнай магутнасці Совецкага Саюза, палепшання матэрыяльнага добрабыту насельніцтва і развіцця соцыялістычнай культуры.

Уздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі характарызуецца значным ростам прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1947 годзе было выпушчана прамысловай прадукцыі на 22 процанты больш, чым у 1946 годзе. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў мінулым годзе павялічылася ў параўнанні з 1946 годам на 32 процанты, а валавы ўраджай збожжавых культур—на 58 процантаў.

Значны поспех совецкай літаратуры і мастацтва, паспяховая дзейнасць навукова-даследчых устаноў, першыя крокі дзейнасці Усесаюзнага таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў, рост сеткі культурных устаноў— усё гэта вызначае і далейшае агульнае развіццё нашай соцыялістычнай культуры.

Паводле папярэдніх дадзеных, бюджэт 1947 года выкананы з перавышэннем прыбыткаў над выдаткамі на 24 мільярды рублёў. Прыбыткі Дзяржаўнага бюджэту ў 1947 годзе ўзраслі ў параўнанні з 1946 годам на 18,4 процанта.

У законе аб Дзяржаўным бюджэце на 1948 год, які прыняты чацвертай сесіяй Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, вызначаюцца новыя велічныя задачы, пастаўленыя перад совецкім народам у трэцім годзе сталінскай пяцігодкі, і забяспечваюцца матэрыяльныя ўмовы выканання гэтых задач. Дзяржаўны бюджэт на 1948 год вызначаны па прыбытках у суме 429.149.697 тыс. рублёў і па выдатках — у суме 388.040.597 тыс. рублёў.

Дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік на 1948 год значна павялічваюцца ў параўнанні з бюджэтам 1947 года. Бюджэт Совецкай Беларусі павялічваецца больш, чым на 6 процантаў у параўнанні з мінулым годам і складае 3.642.375 тыс. рублёў.

Наша рэспубліка атрымлівае вялікія сродкі для мэт яшчэ больш магутнага разгортвання аднаўленчай і стваральнай працы, якая праводзіцца беларускім народам з першых дзён вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У бягучым годзе ўступяць у строй сотні новых прадпрыемстваў, вырастуць тысячы новых жылых будынкаў, у гарадах адкрыецца многа школ, больніц, дзіцячых устаноў, будуць створаны дзесяткі паркаў у гарадах і пасёлках, сотні гарадскіх вуліц упрыгожацца радамі зялёных насаджэнняў, ветліва адчыняцца дзверы новых кінотэатраў, тэатраў і канцэртных пляцовак, значна пашырыцца сетка бібліятэк, калгасныя палі атрымаюць тысячы сельскагаспадарчых машын.

Перад працоўнымі Совецкай Беларусі, як і перад народамі іншых братніх рэспублік, адкрываюцца цудоўныя перспектывы ні з чым непараўнальнай радаснай творчай працы, працы ў імя сваёй Радзімы, у імя ўвасаблення ў жыццё вялікіх ідэй партыі Леніна — Сталіна.

Бюджэт 1948 года забяспечвае матэрыяльныя ўмовы далейшага развіцця беларускай совецкай літаратуры і мастацтва. Клопаты партыі і ўрада аб совецкай культуры знаходзяць сваё адлюстраванне ў адпаведных артыкулах новага бюджэту.

Закон аб Дзяржаўным бюджэце на 1948 год вызначае сабой новы крок у паступальным руху совецкага народа да комунізма. Пісьменнікі і дзеячы мастацтва ў сваёй творчасці павінны адлюстраваць рэальныя вынікі клопатаў партыі і ўрада і асабіста таварыша Сталіна аб росквіце нашай соцыялістычнай дзяржавы, аб совецкім чалавеку, аб развіцці яго культуры і палепшанні матэрыяльнага добрабыту.

ЗА ВЯЛІКУЮ ЛІТАРАТУРУ ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ

(З даклада А. Якімовіча на рэспубліканскай нарадзе дзіцячых пісьменнікаў)

Калі мы гаворым аб значэнні дзіцячай літаратуры, дык перш за ўсё маем на ўвазе яе выхаваўчую ролю. Партыя і ўрад аддаюць выданню дзіцячай літаратуры вялікую ўвагу, нясپынна клапоцяцца аб яе развіцці.

Зараз у СССР выдаецца 19 дзіцячых газет і 14 часопісаў. За адзін толькі 1946 год было падрукавана 777 назваў кніг для дзяцей, агульным тыражом звыш 26 мільёнаў экземпляраў.

Беларуская дзіцячая літаратура пачала ствараца і атрымала шырокія магчымасці для росквіту толькі пасля Вялікага Кастрычніка. Праўда, такія пісьменнікі, як Якуб Колас і Цётка, рабілі спробу ствараць літаратуру для дзяцей яшчэ і ў дакастрычніцкі перыяд, але ніякіх умоў для гэтага ў часы царызма ў Беларусі не было. Я. Коласу і Цётцы ўдалося толькі выдаць невялікія школьныя чытанкі для 1 і 2 класаў.

Заснавальнікам-жа гэтай вельмі важнай галіны літаратуры з'яўляецца народны паэт Якуб Колас. Разам з Янкам Купалам ён прымае актыўны ўдзел у першых дзіцячых часопісах — «Зорка», «Беларускі піонер», «Іскры Ільіча». Добрыя творы напісалі і такія пісьменнікі, як Змітрок Бядуля, Янка Маўр, Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў, Кузьма Чорны, Пятро Глебка, а таксама пісьменнікі малодшага пакалення — Хв. Шынклер, М. Паслядовіч, А. Жаўрук, А. Ушакоў, У. Краўчанка і іншыя. Ад кароткага хрэстаматыйнага апавядання дзіцячая літаратура вырасла да аповесці, паэмы, рамана.

Вайна на некалькі год спыніла рост нашай літаратуры для дзяцей. Але з першых-жа дзён вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў аднавілася выданне дзіцячай літаратуры. У 1944 годзе пачалі выходзіць газеты «Піонер Беларусі» і «Зорка», а з чэрвеня 1945 года — часопіс «Бярозка».

Тэматыка Айчыннай вайны заняла вялікае месца ў літаратуры для дзяцей першых мірных год. У напісанні твораў прынялі і прымаюць удзел каля 30 беларускіх пісьменнікаў. Але, не гледзячы на гэта, усё-ж наша дзіцячая літаратура з'яўляецца адсталым участкам і ні ў якай меры не можа задаволіць патрэб чытача. І зусім правільна ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб беларускай літаратуры адзначыў, што ў нас яшчэ «вельмі слаба развіваецца беларуская дзіцячая літаратура». Гэтая слабасць выяўляецца і ў нізначнай колькасці твораў, і ў абмежаванасці тэматыкі, жанраў.

Вядучым пісьменнікам у дзіцячай прозе з'яўляецца Янка Маўр. Не спыняючыся на аналізе творчасці Я. Маўра апошніх год, хочацца адзначыць адну новую яе якасць. На маю думку, яна заключаецца ў тым, што Маўр выбраўся з джунгляў на шырокую светлую дарогу, якая праходзіць па нашых совецкіх прасторах. І ідзе ён па гэтай дарозе разам з новымі для сваёй творчасці героямі — нашымі сучаснікамі. Значна вышэй узняўся на гэтай новай тэматыцы пісьменнік і як мастак слова. Ёсць у Маўра шэраг апавяданняў, якія з аднолькавым поспехам чытаюцца і дзецьмі і дарослымі. Дзеці знаходзяць у іх мастацкае адлюстраванне свайго жыцця, сваіх інтарэсаў, сваёй работы, а дарослыя — захапляюцца трапнасцю псіхалагічных характарыстык юных герояў.

Проза за апошнія гады папоўнілася творамі маладых пісьменнікаў. З іх найбольш актыўна працуе Мікола Лупсякоў. Нядаўна выйшаў з друку яго зборнік апавяданняў для дзяцей «Мост».

Агульнае ўражанне аб зборніку нядрэннае. У аўтара ёсць педагагічны такт. Ён піша ясна і коратка. Пісьменнік умее знаходзіць канкрэтныя дэталі і індывідуальныя характарыстыкі для сваіх герояў. Вось напрыклад, апавяданне «На прывале». Гэта — невялічкая замалёўка з часоў Айчыннай вайны. Але ў ёй ёсць тое зерне, якое і робіць гэтую замалёўку літаратурным творам, — у апавяданні ёсць думка і вобраз.

Замалёўка «На прывале» запамінаецца, а гэта ўжо сведчыць аб здольнасцях маладога аўтара.

Горш, мне здаецца, удаліся М. Лупсякову апавяданні аб дзецях. Ёсць у іх і надуманасць, і спрэчныя моманты ў паказе паводзін герояў. У апавяданні «Невялікая палонка» расказана пра хлопчыка, які на санной дарозе прасек палонку, каб дастаць з-пад леду аглушанага шчупака. Паказ антыграмадскага ўчынку хлопчыка спатрэбіўся аўтару хутчэй за ўсё толькі для сюжэта: у гэтую палонку правальваецца конь. Тое, што хлопчык заплакаў у апошнім радку апавядання, не выратоўвае н. героя, ні аўтара. Лепшыя з апавяданняў пісьменніка пра дзяцей — «Мост» і «Сустрэчы». У гэтых апавяданнях ёсць спроба даць малюнкі з жыцця нашых школьнікаў.

Лупсякову яшчэ трэба сур'ёзна працаваць і над зместам, і над сюжэтам, і над словам.

Пачаў пісаць удалыя казкі для дзяцей Усевалад Краўчанка. Пакуль што ён надрукаваў толькі дзве казкі — «Чароўны гузік» і «Дзве сяброўкі». Трэба сказаць, што казкі на сучасную тэматыку—досыць цяжкі жанр. У. Краўчанка ў значнай ступені перамог гэтыя цяжкасці. Яго казкі, цікавыя па месту і форме, паказваюць нашых школьнікаў, узаемаадносіны паміж імі. У казцы «Чароўны гузік» вырашаецца пытанне: ці можа быць шчаслівым совецкі хлопчык, калі яго шчасце залежыць ад няшчасця яго сяброў? Эгаізм ці пачуццё каляктывізма і дружбы характэрна для нашых дзяцей? На гэтае пытанне Краўчанка адказвае правільна. Хлопчыка спачатку спакусіў чароўны гузік, які прынёс яму шчасце і ўдачу. Але, калі хлопчык убачыў, што яго шчасце абумоўлена няшчасцем другіх, ён свядома расстаецца з гузікам, кідае яго ў студню. Казка «Дзве сястры» вучыць дзяцей любіць і шанаваць кнігу.

Умее пісаць для дзяцей Янка Брыль. Першую спробу ён зрабіў у апавяданні «Шчасце». Тут і новая для Брыля тэматыка, і новы герой. Шкада толькі, што апавяданне і па сюжэту і нават па мове больш нагадвае нарыс.

Да вайны В. Вольскі напісаў для дзіцячага тэатра дзве п'есы: «Цудоўная дудка» і «Дзед і жораў». П'есы карысталіся вялікім поспехам у дзяцей. Зараз В. Вольскі чамусьці закінуў гэтую вельмі патрэбную і карысную справу. Праўда, у апошнія гады ён напісаў для дзяцей добры нарыс пра героя Совецкага Саюза Гастэла, кнігу апавяданняў і нарысаў пра Белавежскую пушчу.

Першыя творчыя заяўкі ў прозе для дзяцей зрабілі пісьменнікі І. Грамовіч, І. Гурскі, П. Пестрак, А. Кулакоўскі, А. Васілевіч. Мяркуючы па іх першых спробах, яны не маюць права забываць дзіцячага чытача. Дзеці чакаюць ад іх новых твораў.

З маладых аўтараў, яшчэ не членаў Саюза пісьменнікаў, варта адзначыць настаўніка В. Жучкевіча, які напісаў рад апавяданняў. В. Жучкевіч добра ведае дзяцей, іх быт, запатрабаванні. Нядрэнна зарэкамендавалі сябе ў дзіцячай літаратуры пачынаючыя пісьменнікі А. Каўко, С. Тафілін, Сіняўскі.

Дзіцячая проза на рускай мове мае ў Беларусі досыць здольнага пісьменніка А. Міронава. Ім напісаны дзве аповесці і некалькі апавяданняў. А. Міронаў добра ведае жыццё маракоў нашага паўночнага флота, жыццё народаў поўначы. Творы яго маюць вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. З маладых аўтараў, якія пішуць на рускай мове, варта адзначыць празаіка Л. Хахаліна, паэтаў Міхайлава і Сурскую.

Нядаўна выйшлі з друку два зборнік. вершаў — «Васількі» Э. Агняцвет і «Чалавек-сонца» А. Бялевіча. Эдзі Агняцвет піша для дзяцей нядаўна. Яна ўмее зацікавіць малога чытача, умее гутарыць з ім паэтычнай мовай аб самым яму блізкім. Тэмы для вершаў узяты з жыцця дзяцей. Тут і мары дзяцей, і работа, і адпачынак іх. Вельмі важна, што Эдзі Агняцвет не адмаўляецца ад актуальных тэм, якія маюць выхаваўчае значэнне. Шкада толькі, што часта яе добрыя паводле задумы вершы псуе слабая апрацоўка асобных радкоў.

Няроўным атрымаўся і зборнік вершаў А. Бялевіча «Чалавек-сонца».

Лепшы верш у зборніку — гэта лягенда пра Леніна «Чалавек-сонца». Верш напісаны з пачуццём, у лірычным плане. Ёсць у ім трапныя бытавыя дэталі.

Ёсць у зборніку некалькі добрых лірычных вершаў — гэта «І ўсё-такі сам»..., «Лось», «Дзень добры, Дуброва!». А ёсць і такія вершы, якія нічога юнаму чытачу не дадуць: «Ігнатаў флот».

Лепшымі ўзорамі дзіцячых твораў у нашай літаратуры з'яўляюцца вершы Я. Коласа і П. Глебкі. П. Глебка напісаў каля дзесятка вершаў для дзяцей, але кожны яго твор дасканалы і па зместу і па форме.

Нядрэнныя ўзоры паэтычнай апрацоўкі народных казак даў М. Танк. Яго «Галінка і верабей» і «Жораў і чапля» — сапраўды высокамастацкія рэчы ў нашай дзіцячай літаратуры. Гэта-ж можна сказаць і аб казцы Васіля Віткі «Вавёрчына гора».

Беларуская дзіцячая літаратура мае яшчэ шмат недахопаў і далёка не задавальняе чытача ні колькасна, ні якасна. Вельмі мала ў нас твораў для дашкольнікаў і дзяцей малодшага ўзросту. Нельга думаць, што для гэтага ўзросту мы павінны даваць толькі казкі, можна і трэба пісаць кнігі на розныя тэмы.

Мала далі мы аповесцяў для дзяцей сярэдняга і старэйшага ўзросту. А як вядома, аповесць — аснова дзіцячай літаратуры. Я ўжо не кажу аб п'есах, інсцэніроўках, песнях. На поўную сілу павінна прагучаць для дзяцей тэма велічы нашай Радзімы, тэма совецкага патрыятызма. Паказаць у творах піонерскі атрад, совецкую школу, юных раменнікаў, суворацаў, нахімаўцаў— усё гэта тэмы, вартыя добрых аповесцяў. А якая ўдзячная для выхавання нашых дзяцей тэма працы!

Мы сёння нічога не можам сказаць аб такой важнай галіне дзіцячай літаратуры, як крытыка. Яе проста няма. А такое становішча, вядома, не можа спрыяць росту дзіцячай літаратуры. Крытыка нам трэба сталая, сур'ёзная, разумная, якая-б правільна ацаніла творы і вучыла-б аўтараў, асабліва маладых. Гэтага якраз нельга сказаць пра рэцэнзію на зборнік М. Лупсякова «Мост», якая надрукавана ў газеце «Сталинская молодёжь». Рэцэнзенты больш займаюцца агульнымі праблемамі, ходзяць вакол апавяданняў, але не здагадваюцца, глыбока заглянуць у іх змест і разабрацца ў ім, як належыць..

Слаба ў нас афармляецца дзіцячая кніга, хаця многія мастакі-ілюстратары даўно працуюць у гэтай галіне.

Задачы, якія стаяць перад дзіцячай літаратурай, вельмі адказныя. Іх мы здолеем з поспехам вырашыць, і мы іх павінны вырашыць. Гэта патрабуюць ад нас нашы чытачы.

Рэспубліканская нарада дзіцячых пісьменнікаў

4 лютага ў ЦК ЛКСМБ адбылася рэспубліканская нарада дзіцячых пісьменнікаў, скліканая Цэнтральным Камітэтам комсамола Беларусі і Саюзам совецкіх пісьменнікаў БССР.

Даклад аб становішчы і задачах беларускай совецкай дзіцячай літаратуры зрабіў А. Якімовіч.

Першым у спрэчках выступіў Я. Маўр. У асноўным яго выступленне было прысвечана тым адносінам да дзіцячай літаратуры, якія мелі да гэтага часу месца з боку беларускіх пісьменнікаў і ў прыватнасці крытыкаў.

А. Міронаў гаварыў аб тым, што нашы дзіцячыя пісьменнікі мала цікавяцца жыццём дзяцей, рэдка наведваюць школы.

Выхаваўчаму значэнню дзіцячай літаратуры прысвяціў сваё выступленне М. Гамолка. Ён спыніўся таксама на недахопах і памылках у рабоце рэдакцыі дзіцячай літаратуры Дзяржаўнага Выдавецтва БССР за мінулы год.

М. Лупсякоў звярнуў увагу на несур'ёзныя адносіны да дзіцячых пісьменнікаў з боку крытыкаў.

Аб драматургіі для дзяцей гаварыў Ус. Краўчанка. Да напісання дзіцячых п'ес трэба прыцягнуць старэйшых пісьменнікаў, часопіс «Бярозка» і дзіцячыя газеты павінны друкаваць невялікія п'есы для дзяцей, а Выдавецтва — выдаць зборнік іх, — тады нашы школьныя гурткі самадзейнасці атрымаюць рэпертуар, якога цяпер у іх амаль што няма.

Мастакі Ф. Круглянскі і Н. Гуцieў у сваіх выступленнях акцэнтавалі ўвагу на афармленні кніг. Дрэннае становішча паліграфічнай базы, адсутнасць крытычных артыкулаў, у якіх-бы з веданнем справы рабіўся разбор ілюстрацый да кніг, малая зацікаўленасць работай графікаў з боку Саюза совецкіх мастакоў БССР—усё гэта перашкаджае таму, каб нашы дзеці атрымалі не толькі цікавыя, але і прыгожыя кнігі.

А. Вялюгін падверг крытыцы даклад А. Якімовіча. Акрамя таго, што ён быў несамакрытычным, сказаў А. Вялюгін, у ім былі няправільныя разважанні аб паэзіі для дзяцей. Несур'ёзныя адносіны да яе, саматужныя меркаванні аб ёй, непісьменнасць маюць месца і ў рэдакцыях дзіцячай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва, часопіса «Бярозка», маладзёжных і дзіцячых газет.

В. Вітка сваё выступленне прысвяціў тэарэтычным пытанням дзіцячай літаратуры. Ён крытыкаваў таксама нездавальняючую работу секцыі дзіцячай літаратуры Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

— Нашы пісьменнікі прымаюць малы ўдзел у напісанні кніг для дзяцей, — сказаў у сваім выступленні П. Броўка. Ёсць вельмі многа важных тэм, якія яшчэ амаль што не закрануты нашымі дзіцячымі пісьменнікамі, у першую чаргу гэта— баявыя подзвігі совецкіх людзей у час Айчыннай вайны і іх працоўныя подзвігі ў сённешняй мірнай стваральнай працы.

Намеснік начальніка Кіраўніцтва прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б тав. Н. Красоўскі гаворыць аб ідэйнай накіраванасці нашай дзіцячай літаратуры, аб яе выхаваўчай ролі. Рэвалюцыйная рамантыка мінулых бітваў і сённешніх бурных дзён яшчэ займае малое месца ў творах дзіцячых пісьменнікаў, а іх рады — нешматлікія: старэйшыя беларускія пісьменнікі для дзяцей пішуць мала. Нашы крытыкі часамі забываюць адну з сваіх асноўных задач — дапамагаць пісьменнікам. Агульнымі намаганнямі пісьменнікаў, крытыкаў і выдавецкіх арганізацый павінны быць створаны добрыя кнігі для нашых цудоўных дзяцей.

Намеснік Міністра асветы БССР тав. С. Умрэйка скардзіўся на цяжкасць укамплектавання кнігамі школьных бібліятэк, на адсутнасць добрых хрэстаматый для літаратурнага чытання. Да гэтага пытання ён падыйшоў аднабакова і затрымку ў складанні новых хрэстаматый вытлумачыў тым, што па некаторых тэмах нельга знайсці тэкстаў сярод твораў беларускіх пісьменнікаў.

Несур'ёзным было выступленне і намесніка начальніка Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР тав. Яфрэмава. Ён патрабаваў ад пісьменнікаў напісання рэпертуара для тэатра лялек і эстрады, аднак адначасова даказваў, што пытанне аб п'есах для дзяцей не ўваходзіць у кампетэнцыю Кіраўніцтва па справах мастацтва.

П. Захараў («Зорька») абмежаваўся толькі пацверджаннем сваіх думак, выказаных у рэцэнзіі на зборнік апавяданняў для дзяцей М. Лупсякова, напісанай без павагі да пісьменніка. Ён нічога не сказаў аб рабоце рэдакцыі газеты «Зорька» ў галіне папулярызацыі твораў для дзяцей і іх напісання.

Зусім прамаўчалі прадстаўнікі іншых маладзёжных і дзіцячых газет. Нарада называлася рэспубліканскай, аднак на ёй прысутнічала вельмі мала таварышоў з абласцей і не было іх ніводнага выступлення.

Вынікі нарады падвёў сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Я. Канаплін. Ён пазнаёміў удзельнікаў нарады з умовамі конкурса на лепшы твор для дзяцей.

Бюро ЦК ЛКСМБ і сакратарыяту Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі даручана вылучыць кандыдатаў на ўсесаюзную нараду дзіцячых пісьменнікаў.

Ус. КРАЎЧАНКА

Кніга для дзяцей

Перад пісьменнікам, які паставіў сабе мэтай пісаць для дзяцей, стаяць нялёгкія задачы. Юны чытач патрабавальны, ён не будзе чытаць незаймальны, шэры твор, напісаны сухою мовай, ён не захопіцца творам, у якім робяцца якія-б там ні было «скідкі» на ўзрост чытачоў. Паводле крылатага выразу, для дзяцей трэба пісаць з той-жа высокай патрабавальнасцю, як і для дарослых, толькі яшчэ лепш. Сваімі творамі дзіцячыя пісьменнікі павінны выхоўваць нашу совецкую дзетвару ў комуністычным духу, паказваць ім лепшыя якасці чалавека нашага соцыялістычнага грамадства—любоў да Радзімы, да працы, мужнасць, таварыскасць.

Нядаўна ў Дзяржаўным Выдавецтве БССР выйшаў зборнік апавяданняў для дзяцей М. Лупсякова «Мост». Імя М. Лупсякова ўжо знаёма юнаму чытачу па апавяданнях, якія ён друкуе ў нашым перыядычным друку. Лепшыя творы М. Лупсякова сведчаць аб тым, што ён здольны і ўдумлівы пісьменнік, які разумее задачы, пастаўленыя перад дзіцячай літаратурай.

Чытаючы новы зборнік М. Лупсякова адчуваеш цеплыню, любоўныя адносіны аўтара да сваіх станоўчых герояў, адчуваеш, на чым баку сімпатыі аўтара. Элемент павучальнасці, аўтарская думка не навязваюцца чытачу, як кажуць не «выпіраюць» з твора, а вынікаюць з яго арганічна.

Да ліку лепшых твораў зборніка належыць апавяданне «Мост». У ім расказваецца, як совецкія дзеці, выхаваныя ва ўмовах нашага соцыялістычнага ладу, уключаюцца ў грамадскія справы; яны разумеюць, чаго патрабуе ад іх абавязак члена совецкага каляктыва. Вясною, вяртаючыся са школы, дзеці ўбачылі, што масток праз рэчку, праз якую ім трэба ісці, амаль што разбураны ледаходам і хутка будзе знесены вадою. Ім ніхто не загадвае, ды гэта і не іх абавязак, але дзеці распачынаюць рамантаваць масток. Да іх паступова далучаюцца дарослыя з сякерамі, пілами—і вось к вечару мост гатовы. Зроблена важная і карысная грамадская справа, а ініцыятарамі яе з'явіліся дзеці, школьнікі і піонеры. Аўтар уважліва прасачыў, як зараджалася гэтая справа, падслухаў розныя галасы ў групе дзяцей—і больш адсталых, і тых, у якіх высока развіта пачуццё калектывізма. Стасік абыякава ставіцца да пачынання дзяцей («мне дык што, у мяне цётка, я ў яе жыць магу»). Вера спалохалася, што не пройдзе рэчку, і пачала плакаць. Рыгорка, перапыніўшы Стасіка, моўчкі рушыў да мастка і пачаў прыладжваць адарваныя дошкі. За ім прымаюцца за працу ўсе, а Стасік нават ганьбіць сябе ў думках—«чаму не ён першы гэта прыдумаў». Трэба спыніцца яшчэ на апавяданні «Сустрэча», у якім вучань Міхась у выніку свавольства ў трамваі трапляе ў няёмкае становішча і горка раскайваецца ў сваіх дрэнных учынках.

І ўсё-ж, на жаль, кнігу «Мост» нельга прызнаць дасягненнем нашай дзіцячай прозы. Не ўсе апавяданні зборніка стаяць на аднолькавым мастацкім і ідэйным узроўні. Зборнік няроўны—побач з добрымі творамі змешчаны апавяданні слабыя, мастацкі непераканальныя, з дробнай і невыразнай думкай.

Да такіх твораў трэба аднесці «Аўтамабіль», у якім аўтар не здолеў знайсці мастацкіх сродкаў, каб паказаць, як дзеці караюць і выключаюць са свайго здаровага каляктыва хвалька.

Наогул аўтара трэба папракнуць у тым, што часамі ён як-бы не даводзіць сваю думку да канца, канчае свае апавяданні неяк паспешліва і абы-як. Такая няўдалая канцоўка атрымалася ў апавяданні «Невялікая палонка»: «Змітрок паглядзеў спачатку на бацьку, потым на матку і раптам расплакаўся». Аўтар не здолеў лагічна дабудаваць створаны ім вобраз хлопчыка, а напісаў канцоўку, як кажуць, на скорую руку. Такая паспешлівасць зніжае мастацкую і ідэйную вартасць многіх апавяданняў М. Лупсякова.

У далейшай сваёй працы аўтар павінен улічыць як і тое добрае, чаго ён дасягнуў у зборніку, так і свае недахопы. Паглыбляць ідэйную значнасць сваіх твораў, удасканальваць мастацкае майстэрства, мову, авалодваць умельствам пісаць цікава і займальна — такія задачы стаяць перад здольным дзіцячым пісьменнікам М. Лупсяковым. Пры ўмове ўпартай і добрасумленнай працы ёсць усе падставы спадзявацца, што М. Лупсякоў створыць цікавыя і карысныя дзіцячыя творы.

Антон БЯЛЕВІЧ

СЭРЦА МУЗЫКІ

Паэт Антон Бялевіч нядаўна закончыў новую паэму „Сэрца музыкі". Тэма гэтай паэмы— дружба народаў, іх сумесная барацьба за свабоду.

Беларускі хлапец Ігнат пакахаў латышку Ліалету, у якую закаханы і дэспат-князь. Князь асляпляе музыку.

З бунтарнымі спевамі, з гімнамі працы прабіраецца Ігнат з Ліалетай у Беларусь.

Ніжэй друкуем урывак з гэтай паэмы.

Сонцу насцеж адкрылі акно —
Свецяць вочы ў акне Ліалеты.
— Што-ж убачыла вока адно,
Адкажы нам, музыка, на гэта?
Ен рвануўся: — Мая Ліалета!..
— Я з табою, твая, голуб мілы,
Ты не будзеш адзін адзінокі,
Мы навекі з табой падружылі...
Бліснуў князь з рукава, — асляпілі
І другое музыкава вока.
Расчыніліся дзверы шырока:
Князь Ігната на двор выпхае.
— Хай сляпога цябе пакахае,
Глянь красуні цяперака ў твар...
О, часіна цяжкая, ліхая!
Сонца знікла — баялася з хмар
Глянуць ясна ў музыкавы вочы;
Салаўі панямелі ў кустах,
Толькі ласка і позірк дзявочы
Асвятлялі сляпому ў свет шлях.
. . . . . .
І дыбаў ён на голас, на пах
Чабору, рамонкі, зялёнай асокі;
Хапаўся за вецер, за промень высокі:
Злавіць іх не мог ён: плылі яны міма.
Шукаў ён блакіту сляпымі вачыма:
Не знойдзе блакіту,—счарнелі блакіты.
Жаўцела там жыта, — счарнела і жыта.
Бялела тут грэчка,—скрозь чорная сажа.
Сінела там рэчка: — дзе рэчка, хто скажа?
Шукае ён сонца: — Хто сонца пакажа?
Закрытыя вочы: — Хто вочы развяжа?
Павеяла мора вятрамі на вочы:
Не згоніць вятрамі з вачэй цёмнай ночы.
Духмянам гарачым павеяла жыта:
Не бачыць музыка — змрок чорны разліты.
Махнулі лістамі у вочы каліны:
Не бачыць музыка зялёнай даліны.
На вочы хмарынка дажджом пакрапіла:
З вачэй чорнай ночы хмарынка не змыла.
О, долы, о, неба, о, божа мой мілы!—
Прасіла,
Маліла,
Свет белы каханка,
Каб вочы-заранкі
Зноў глянулі светла,
Каб зноў іх пацешыць усмешкаю ветлай.
У долаў пытала
Такое раслінкі;
На травах шукала
Такое расінкі;
Хмарынцы гукала:
— Хмарынка, хмарынка,
Дай гэткай дажджынкі,
Каб пырснуць у вочы — зноў вочы глядзелі..
І з вейкаў слязінкі ў самое зляцелі,
І ўпалі, як іскры, на вочы музыку,
І ў змроку мігнулі, і радасным крыкам
Музыка прастору гайдае наўкола:
— Кавалачак неба відаць мне вясёлы,
Мне пасмачка сонца відаць, Ліалета.
Дадому, ў Палессе: ратунак мой гэта.
Мо' 'вецер гаючы, мо' подых дамоўкі
Мне вочы адкрыюць, зірну на свет зноўку?
Дадому, дадому, у родны закутак,
Спяшацца, спяшацца, пакуль стаіць лета...
У доўгай дарозе стапталі абутак,
Другія ўжо лапці плятуць з Ліалетай.
На ўзмор'і сляды іх, ідзе іх след логам.
Пагоні не шле князь:
— Навошта пагоня?
Пакіне сляпога, забудзе сляпога,
Назад яе гора паверне, пагоне,
Чакаю красуню ў харомах сягоння...
Дарэмна чакаеш красуню ты, княжа:
Дзе-ж сіла, якая іх сэрцы развяжа?
Дзе-ж тыя дукаты, дзе-ж тыя напасці,
Якія разлучаць іх долю, іх шчасце?!
Спеў сэрцаў у змроку, як чыстая іскра,
Ен ціхі, як голуб, ён гулкі, як выстрал
Хваляў гулкіх на моры пад бураю:
— Нас апраналі нявольніцкай скураю.
Цесна пад ёю і сэрцу і мускулу.
Сілай парвалі скуру мы вузкую.
Прагі да шчасця — не змераеш мераю.
Мечам халодным і вострай сякераю
Нельга засекчы волю крылатую,
Нельга купіць яе платай багатаю!
Дружбы сардэчнай і шчырае еднасці
Срэбрам не купіш ні ў горы, ні ў беднасці.
Куфры не трэба нам поўныя золата:
Чыстае золата — добрае долата;
Добрае долата, гэблік ды пілка нам,
Здатныя рукі, ды моцнасць асілкава!
Грымнуць дадолу нам дуба разгатага,
Працай сагрэцца да поту дзесятага!
Хай наша праца нам беднасць на бок змяце.
Сесці, як трэба, усім, — смела на покуце!
Хлеба накроіць жытнёвага лустамі,
Страву аздобіць закрасамі тлустымі!
І, развітаўшыся шчыра з работамі, —
Стукнуць-бы, грукнуць-бы добрымі ботамі!
Дзеці прытупнуць нам пяткамі босымі.
Як-жа ляпей яшчэ жыць пад нябёсамі?!
Ходзім за плугам мы, ходзім за косамі.
Як-жа ляпей яшчэ жыць пад нябёсамі?
Вецер шавеліць нам лапікі зрэбныя.
У кайстру нам зоры падаюць срэбныя.
Стол наш багаты, стравы царовыя:
Водыр мурожны, ветры гаёвыя.
Лісце — пярына. Мыемся росамі.
Як-жа ляпей яшчэ жыць пад нябёсамі?!
Цягнем па небу мы песню напятую,
У сэрцы стрымай яе — лопне крылатае
Сэрца ад песні многагалосае:
З намі юнацтва русавалосае,
З намі надзея поплеч ідзе!..
Сонейка ўсходзіць. Промні ў вадзе.

МОЙ ГЕРОЙ...

Дарагі мой, лірычны герой,
Сэрца ў сэрца жывём мы з табою.
Колькі пройдзена сцежкай адной
Да вайны, у вайну, пасля бою!
Пад сасною мы спалі не раз
У пярыне імшыстай Міная,
Хай не лёгкі і горкі той час
Не спаткае ў жыцці болей нас,
Абыходзіць хай ён, абмінае.
Каб не красці больш нам журавін
У глушцоў, а грыбоў—у вавёркі;
Каб не грукаў над намі гром мін
Каб не слаўся над намі дым горкі..!
Дарагі мой лірычны герой,
У рабоце гартуй свае сілы!
Сэрца ў сэрца жыву я з табой,
Параднілі нас гора і бой,
І, цябе не пакрыўджу, мой мілы,
Буду верным табе да магілы!
Я душою пранік у душу,
Знаю думы твае я і мары.
І чым ёсць ты,—я так і пішу,
Ні паўслова людзям не схлушу,
Не скрыўлю я душою, таварыш.
Пакідаў ты бацькоўскі куток,
Адступаў ты ад роднай сялібы.
Я з табою ішоў крок у крок.
На душы было лёгка нам хіба?
Скруха ў сэрца лягла чарней скібы.
Партызанскі прыняў цябе бор,
Як салдата, пад цёмныя шаты.
Не шукаў ты лісічных нор,
Не лічыў ты з каханкаю зор,
Бо хадзіў ты ў чужынца па пятах,
Бо лічыў колькі знішчана катаў!
І не чуў ты, як дуб ліст на ліст,
Нібы карты, кідае на лета.
(Як пісаў мой знаёмы пра гэта)
Салаўя—замяняў кулі свіст,
А зарніцу—успышка ракеты.
Не да лісцяў было нам з табой,
Не да выраяў горкіх і сумных.
Целам грэлі лісцё пад вярбой,
І жылі мы жнівом і касьбой,
І душой былі ў кузнях і гумнах.
І ў хвіліну раздум'я й тугі,—
Нылі сэрцам не менш за другіх,
Што ржавеюць пад стрэхамі косы;
Што не кошаны жоўкнуць лугі
І не стануць стагамі ў нябёсы.
Сумавалі з табой па сярпу,
Па жытнёвым пахучым тарпу,
Па цяслярскай увішнай сякеры.
А ні меж не было, а ні меры
Суму нашаму, гневу і гору.
Толькі з намі была наша вера,
Што да шчасця мы вернемся з бору!
Што пакінем мінаеўскі мох,
Прыдзем зноўку на родны парог,
Ці на прысак бацькоўскае хаты.
І прышло доўгажданае свята.
Ты касец зноў і косіш мурог,
Кроіш глебу, як цёплы пірог,
Ты цясляр, ты каваль, ты араты.
Ты пчаляр, рыбалоў, плытагон,
На глушца ты палюеш у ранне.
Як-жа імя тваё? Шмат імён:
Апанас, ды Ігнат, ды Ціхон,
Ды Малання, Алеся, Аксання,
Ды яшчэ колькі новых імён?!..
Ці юнак ты, ці сталы, герой,
Хай мужчына ты, хай ты кабета:
Быў-бы толькі ты шчыры душой,
Чысты думай крылатай сваёй,—
Сэрца ў сэрца заўсёды з табой,
Шлях адзін да адной нашай мэты;
Шлях адзін і адзіная мара:
Комунізма падняць сцяг высока!
Дай-жа руку, герой і таварыш,
Нам да мэты ужо недалёка!

Творчасць літаратурнай моладзі

★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★

БОЙ У ЛЕСЕ

(Урывак з аповесці)

М. ТКАЧОЎ

Іх толькі што сабраў Змітрок Перагуда і, выстраіўшы ўсіх у адну шарэнгу, правяраў прыгоднасць зброі і наяўнасць патронаў. Зброя, як і вонкавы выгляд кожнага партызана, была самая рознастайная. Здавалася, быццам такую стракатасць хтосьці выдумаў знарок.

Вось стаіць Вася Каралькоў, нізкарослы і дробнатвары, з шустрым позіркам круглых вачэй. Яго шчокі і верхняя губа густа ўсеяны срэбнымі, як пух, валаскамі—у Ваські той узрост, калі трэба пачынаць галіцца. На ім шырокі шэры пінжак з даматканага сукна, туга падпяразаны на апошнюю дзірку папругі. На галаве ў яго вялікая бацькава шапка. Яна назойліва спаўзае на бровы, брылем звісае над вушамі і надае Ваську выгляд якогасьці казачнага грыба-баравіка. Вася, здавалася, сам уяўляў малазначнасць свайго знешняга выгляду і таму, нібы жадаючы кампенсаваць гэты недахоп, стараўся быць сур'ёзным і цягнуўся ўверх. Каб не запэцкаць у грязь прыклад вінтоўкі, ён паставіў яе не на зямлю, а на насок бота, любоўна трымаў яе, амаль зусім новую, добра пачышчаную і з якойсьці гарэзнасцю паглядваў на Макара Аўдзеевіча, які стаяў побач, на яго паляўнічую стрэльбу-цэнтралку, на шырокую раздвоеную, як ільняны сноп, бараду.

— Што паглядваеш, мяняць зброю хочаш?—заўважыўшы васькаў позірк, буркнуў Макар Аўдзеевіч.

— Не вельмі прыспешыла. Што я буду рабіць з вашай лёскаўкай?

— Бач, хоць малы, а на язычок востры. Прыдачу давай—не змяняю. Са сваёй стрэльбы я ўжо, хлопча, не аднаго звера ўклаў, а што ты зробіш са сваёй—паглядзім яшчэ, як казаў той сляпы.

— Дзед Макар, а хіба сляпы бачыць?—засмяяўся Васілёк.

— Ат, з такім блазнюком, як ты, хіба згаворышся.

— Што за сварка ў страю?—пачуўся голас Перагуды.

Макар Аўдзеевіч яшчэ раз паглядзеў на Васілька, хацеў было штосьці сказаць, нават рот прыадкрыў, але, убачыўшы, што да яго кульгае Перагуда, стрымаўся.

— Ну, як, Аўдзеевіч, твая бранябойка спраўная? Набояў многа?—з затоеным гумарам спытаў Змітрок, аглядваючы цэнтралку.

— Спраўная. Трыццаць набояў ёсць, зарадзіў карцеччу, што зберагаў для ваўкоў.

— Здорава, — усміхнуўся Перагуда і, вярнуўшы старому стрэльбу, пасля кароткага роздуму сказаў мяккім тонам, каб не пакрыўдзіць:

— Стары ты, Аўдзеевіч. Можа-б у вёсцы застаўся, за парадкам пасачыў-бы тут?

— Ты што, Змітрок, кпіць з мяне сабраўся, ці хочаш, каб я цябе аблаяў?—узлаваўся стары.

— Я сур'ёзна кажу. Цяжка табе будзе.

— Нічога, як-небудзь, — апраўдваўся Макар Аўдзеевіч.—Сам заставайся, ты-ж не здаравей за мяне, інвалід яшчэ. Або вось гэтага шпінгалета пакінь, — дадаў ён, паказаўшы на Васілька.

— Ты мяне, дзед, не чапай!—грозна засупярэчыў Каралькоў.

Перагуда, зразумеўшы, што з яго прапановы нічога не выйдзе, толькі безнадзейна махнуў рукой і адышоў у бок. Убачыўшы Коўбеца, які выйшаў з хаты, ён паведаміў яму:

— Усё гатова.

* * *

У лесе дзяўчат сустрэў сувязны Перапечкіна:

— Давайце ў першую роту, параненыя ёсць,—сказаў ён і павёў дзяўчат за сабой.

Не высоўваючыся з лесу, яны ішлі на поўдзень, усцяж усходняй украіны, па тыле партызанскай абароны. Над імі раз па-раз вішчэлі міны, гудзелі снарады, кулі цокалі аб галіны дрэў. Дзяўчаты часта прыпыняліся, хаваліся за камлі дрэў, чакаючы выбуху снарада або міны. І калі чуўся выбух, яны таропка ўсхопліваліся з месца і беглі далей. Над лесам пранёсся прарэзлівы гул самалётаў, і праз некаторы час пачуліся выбухі бомбаў.

Пад нагамі патрэсквала сціснутая начным марозам скарынка зямлі, у густых зарасніках яшчэ там-сям пахрусталі снег, які не растаяў, а ў нізінах цвякчэла вада. Ногі былі мокрыя. Але на гэта ніхто цяпер не звяртаў увагі. Па калені ў вадзе, дзяўчаты пераходзілі раўчукі, балоты. Так яны мінулі ўчасткі абароны трэцяй і другой рот і, узняўшыся на ўзгорак, падыйшлі да перадняга краю першай роты. Пачыналася дробналессе. Далей яны не маглі ісці на ўвесь рост, бо ўся мясцовасць прашывалася кулямі, перакапвалася безупыннымі разрывамі мін і снарадаў.

Наперадзе паказалася вялікая паляна. Яна нагадвала поўкруг, у цэнтры якога высіўся курган—магіла часоў шведскай вайны. На паляне там-сям віднеліся гнілыя пні, кусты арэшніка і маліннику. З паляны было добра бачна наваколле: увесь лес, суседняя вёска, палеткі і хмызнякі, што раскінуліся ў нізіне. Ад палеткаў паляну аддзяляла толькі вузкая кайма маладога асінніку, які рос па-над ручаём на схіле ўзгорка і дугой выпіраўся з лесу.

Гэтая важная выспа асабліва непакоіла немцаў. Прышоўшы на золаку ў вёску, што за кілометр адгэтуль на ўсход, яны першыя свае снарады і міны адразу-ж паслалі сюды, мяркуючы, што на такой выспе партызаны абавязкова наладзяць абарону. Асіннікавы пералесак і паляну яны абстрэльвалі доўга і ўпарта. Але партызаны, якія добра акапаліся і замаскіраваліся па-над ручаём у старых акопах часоў сорак першага году, маўчалі, ні адзіным выстралам не выдаючы сябе. Камандзір першай роты Пагрэбняк, як і яго байцы, ад нецярплівасці пачаў хвалявацца, неаднаразова праз сувязнога дамагаўся ад Перапечкіна дазволу пачынаць бой, але заўсёды атрымліваў адказ:

— Маўчаць, не выдаваць сябе.

Нарэшце, нямецкае камандаванне палічыла, што страляць па выспе хопіць і пусціла наперад аўтаматчыкаў. Каля сотні нямецкіх салдат, віляючы паміж кустоў і канаў, рассыпаліся па нізіне, спяшаючыся да выспы. Пагрэбняк у гэты час бегаў з узвода ва ўзвод і крычаў:

— Чакаць каманды!

Партызаны згаралі ад нецярпення, бачачы, як немцы пераправіліся праз ручэй і пачынаюць падымацца на выспу; да ворага засталося не больш 50 метраў. І раптам ва ўсіх адлягло ад сэрца,—камандзір роты даў сігнал—дзве кароткія чаргі з аўтамата. Рэха стрэлаў ніхто не пачуў—яго захліснула дружная страляніна партызан. Пералесак, які да гэтага цярпліва маўчаў, пагрозна загрукатаў.

— Глядзі, глядзі, як заёрзаў,—закрычаў Макар Аўдзеевіч Каралькову, паказваючы на параненага немца, які скаціўся да ручая, і, схапіўшыся за жывот, біўся ў лужы.

— Дабі, дзед!—кінуў Васілёк, перазаражаючы вінтоўку.

— І так здохне, шкада набояў, — і, выстраліўшы ў другога немца, што ўцякаў да вёскі, папрасіў Васілька:—Нутка, лупяні вунь таго, цыбатага, мая штось не дастае!

— Сапсавалася, можа? Гэта, дзед, не на ваўкоў паляваць.

Васілёк склаўся і выстраліў. Немец, які ладна ўжо адбег ад пералеска, узмахнуў рукамі, спачатку неяк тарганўўся назад, нібы выпростваючы спіну, а потым адразу рухнуў на зямлю.

Бой, што ўспыхнуў маланкава, раптоўна і патух; толькі дзесьці на левым флангу яшчэ патрэсквалі стрэлы. Гэта дабівалі ў хмызняку асобных немцаў, якія спрабавалі ўцякаць па кустах да вёскі.

Каля выспы і на лугу валяліся трупы нямецкіх карнікаў. З пралеска спусцілася ўніз некалькі партызан і пачалі падбіраць зброю.

— У акопы!—пачуўшы выццё снарадаў і мін, закрычаў камандзір роты тым партызанам, што былі пасланы збіраць зброю. — Абманулі немца, узлавалі. Цяпер пачне лупіць, толькі трымайся,—і, глянуўшы на Макара Аўдзеевіча, здзіўлена запытаў: — А вы ўсё яшчэ з цэнтралкай? Перагуда!

— Я, таварыш камандзір...

— Неадкладна замяніць усе гэтыя пстрыкаўкі на аўтаматы! Ідзіце, возьміце ў старшыны!

— Есць! Я гаварыў Аўдзеевічу — не згаджаецца; страляць, кажа, не ўмею з аўтамата.

— Навучыць!

— Я і з сваёй пстрыкаўкі, слава богу, уклаў аднаго, — для апраўдання ўставіў Макар Аўдзеевіч.

— Баі будуць вялікія. Для вас хачу дабра, а вы—на дыбы. Не памяняеце—адпраўляйцеся дамоў, да сваёй старой!

— Добра, таварыш начальнік, возьму аўтамат. Толькі дазвольце, каб пры мне была і цэнтралка. Яна мне дорага, ад калгаса прэміроўка.

Камандзір роты ўсміхнуўся, махнуў рукой, і, перачакаўшы выбух снарада, згорблена пабег па акопах на левы фланг.

Праз гадзіну пачуўся гул авіяматораў. Усе глянулі ў неба і ўбачылі два самалёты з фашысцкай свастыкай на двайных фюзеляжах—самалёты, якіх тутэйшыя партызаны звалі «мажарамі» альбо «драбамі». Яны, відаць, былі выкліканы па радыё і атрымалі дакладныя весткі аб размяшчэнні партызан. Выляцеўшы з-за лесу, самалёты адзін за другім прайшліся якраз над партызанскай абаронай. Пералесак уздрыгануўся. Перасмыкнуліся дрэвы і кусты, тонучы ў цёмных земляных слупах. Калі замоўклі выбухі, там і сям пачуліся енкі і крыкі параненых.

— Дзядуля, дзядуля... — пачуў Макар Аўдзеевіч, калі выбраўся з-пад дрэва, што з коранем было вывернута бомбай і ўпала на акоп.

Стары пераскочыў макавіну і, прабегшы крокаў пяць па акопу, убачыў Васілька, які ляжаў на баку. Юнак жаласна стагнаў, прасіў дапамогі. Сваімі рукамі, па якіх нястрымна лілася ў рукавы пінжака кроў, ён моцна сціскаў параненую шыю.

— Дзядуля...—ледзь чутна шапталі яго збялелыя вусны.

— Ах ты, дзіцятка маё... Чым-жа мне перавязаць цябе?

Спачатку ён расшпіліў кажух і хацеў было ірваць паркалёвую сарочку, але, штосьці ўспомніўшы, адумаўся, хуценька зняў з шыі гарусавую хустку, якую яму завязала старая перад дарогай, каб было цяплей. Ён перавязаў шыю хлапчуку і толькі тады аглянуўся па баках, нібы пытаючы ў кагосьці, што яму рабіць далей.

— Адвядзі яго на перавязачны пункт,—нібы адгадваючы яго думкі, сказаў Перагуда, які ў гэты час падыйшоў да іх, і, глянуўшы на астатніх партызан, скамандаваў:—За мной, у лес!

Па загаду Паграбняка ўся рота знялася з месца і таропка пайшла ў лес. Толькі яна ўвайшла ў запасныя акопы, як тыя-ж самыя два самалёты зноў скіраваліся на пералесак. Яшчэ большы град бомбаў страсануў асіннік. Затым на момант стала ціха, а праз колькі хвілін зноў самалёты зрабілі круг над пералескам. На гэты раз яны абстралялі выспу з кулямётаў, а для псіхічнага ўздзейнічання скінулі некалькі пустых бочак, кавалкаў рэек і скрынак тары. Увесь гэты баласт падаў на зямлю са страшэнным выццём.

Паграбняк меркаваў, што самалёты зноў вернуцца для абстрэлаў і бамбёжкі. Але прайшло хвілін дваццаць, а яны не паказваліся. «Відаць, зусім паляцелі»,—падумаў камандзір роты, і аддаў загад:

— Заняць ранейшыя пазіцыі!

Партызаны падняліся з месц і рушылі наперад, але, ступіўшы на паляну, адразу-ж адхлынулі назад, бо з пералеска па іх раптоўна секануў шквал агню. Паграбняку, калі ён усвядоміў абстаноўку, здалося, што ўнутры яго ўсё перавярнулася. Пакуль самалёты бамбілі, новая група нямецкіх салдат прабралася ад вёскі і вось зараз апынулася ў пералеску. Паграбняк разумеў, што калі немцы завалодаюць гэтай выспай — значыцца выйграюць бой не толькі з яго ротай, але і з усім атрадам. «Якая ганьба!..»—увесь скалануўшыся ад злосці на сябе, падумаў Паграбняк.

— Ну, што завагаўся?—раптоўна пачуў ён ззаду сябе голас Перапечкіна.

— Вінават, Андруша, падвёў,—загаварыў Паграбняк і апусціўся на дубовы пень.

— Ну, раскіс, не будзь бабай, усё ведаю. Правільна зрабіў, што вывеў людзей з-пад вернай смерці. Давай атаку, зараз-жа выбіць немцаў!

Паграбняку думалася, што ён дапусціў памылку, вывеўшы людзей на час бамбардыроўкі з пералеску, а тут на табе—Перапечкін ухваляе яго ўчынак. Пачуццё адчаю і злосці на сябе знікла. Ён, як акрылёны, ускочыў з пня і падаў сігнал да атакі.

Партызанскія ўзводы рвануліся наперад.

Перапечкін уміг скінуў з сябе ватоўку, выскачыў на паляну.

— Андруша, вярніся, мы і без цябе,—крычаў Паграбняк, бегучы побач з камандзірам атрада.

Але Перапечкін не адказваў, ён нічога не чуў. Ён бег і крычаў на ўвесь голас.

— Напе-ерад!

Над палянай загучэла магутнае «ура».

Перапечкін стрымгалоў бег, сеючы па пералеску агонь з аўтамата. Вось ён мінуў кусты і выскачыў на адкрытую мясціну паляны. І раптам сціхіў бег, як спутаны, зрабіў колькі крокаў, пахіснуўся і мешкавата асунуўся каля кургана.

— Андруша, што з табой?—схіліўся над ім Паграбняк.

— Ногі...—і зноў тонам загаду:—Напе-рад!

Ён бачыў, як партызаны ўварваліся ў пералесак, чуў, што там не сціхае страляніна, намагаўся ўзняцца і не мог. Пры самым нязначным руху ногі пранізваліся нясцерпным пякучым болем. Гэты боль перадаваўся па ўсяму целу, калоў у скроні, мозг. Перапечкін паспрабаваў паўзці, падцягнуўся на руках і, сціснуўшы зубы, упаў галавой на рукі: «Адказалі, акаянныя, перабіты», — прамільгнула ў яго думка. І раптам ён пачуў, як хтосьці дакрануўся да ног. Боль з новай сілай разануў па целе. Ад гэтага Андрэй нібыта ачуняў, ускінуў павекі і пакутліва-здзіўленым позіркам паглядзеў на дзяўчыну, быццам не даваў сабе веры, што перад ім Надзя. Глядзеў з хвіліну, а потым зноў упаў галавой на рукі.

— Кладзі на палатку. Прыгніся — кулі,—пачуў ён далёкі незнаёмы голас і адчуў, як яго перавярнулі на спіну і кудысьці пацягнулі.

Разам з сяброўкай Надзя пад агнём паўзла з сярэдзіны паляны па ўскрайку лесу. А калі над іх галавой змоўкла ціўканне куль, яны прыпыніліся, нажом разрэзалі абедзьве калашыны андрэевых ватнікаў і пачалі перавязваць раны.

—Як атака?—спытаў ён, разамкнуўшы павекі.

— Скончана. Немцы выбіты з пералеска.



У чытальнай залі Цэнтральнай бібліятэкі імя Леніна (гор. Мінск).
Фота Г. Бугаенкі.

Алесь ПЫСІН

СНЯЖЫНКІ

На поўнач мёрзлую, на край зямлі,
Мінуўшы поўдня цеснага граніцы,
Шарэнгі дрэў мічурынскіх пайшлі,
Каб з полюсам далёкім парадніцца.
На снежнай тундры выставіў мароз
Заслоны ледзяныя —
Ды дарэмна.
У грунт, дзе толькі мох паўзучы рос,
Ўвап'юцца хутка саджанцаў карэнні.

І расцвітуць ля стойбішчаў сады,
На след аленяў паляцяць пялёсткі,
Вятры падхопяць іх, сыпнуць сюды
З вітаннем поўначы на дол дняпроўскі.
... Сняжынкі падаюць. Гляджу на дол,
На белізну, што проста слепіць вочы:
Пялёсткі ўсё заслалі навакол,
Пялёсткі белыя садоў паўночных.

РАКА

Па праўдзе сказаўшы, фізічная карта
Не лічыцца з рэкамі гэткімі...
Плывуць яе хвалі ні ціха, ні шпарка.
Навошта спяшацца ім з трэскамі?
А трэскі на хвалях з стагодняга дубу,
Збірае з іх рэчка флатылію;
І, мусіць, не знае, што людзі на службу
Бяруць яе розумам-сілаю.

Спрадвечную плесню, зацішша і ціну
Дубовыя палі распырскалі,
І хутка ўжо дужай рукою плаціна
Узніме ўверх воды празрыстыя.
І кола турбіны струмень вадаспада
Праверыць сваімі далонямі,
Імклівыя хвалі ў калгасныя хаты
Паймчацца агнямі цудоўнымі.

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ

(вучань 7 класа Будаўнянскай НСШ Дрыбінскі раён, Магілеўская вобласці).

КЛЁН

Над новай хатай клён стары
Стаіць, нібы асілак,
Якога злосныя вятры
У буру не скрышылі.

І не разбілі перуны
Яго, як іншых, летам.
Напэўна гэтае вайны
Ён стане манументам.

Спакойна вецер угары
Гуляе, як калісьці.
І сонца льецца з вышыні
У бронзавыя лісці.

Яны шасцяць усё мацней,
Усё мацней, чым далей.
Гляджу на іх—здаецца мне
Што гэта ўсё — мядалі.

Што гэта клён, магутны клён
Сягоння з рук прыроды
За варту верную сваю
Прымае ўзнагароды.

В. ГИЛЬ

НА АЛЛЕЕ КОРОЛЕЙ

(Берлинские наброски)

В Тиргартене есть аллея
Широкая и на ней
Немцы, трудов не жалея,
Расставили всех королей.
Грязные, в копоти, пыли,
Совсем не царский фасон,
На пьедесталах застыли
«Фюреры» всех времён.

Фридрихи, Карлы, Вильгельмы
(У истории—быстрый бег)
Взирают старые шельмы
На крах молодых коллег.
И там, где осколки стальные
Снесли одному голову,
Он больше похож, чем другие,
На то, чем он был на яву.

Іван НАУМЕНКА

БРЫГАДЗІР

Ішоў палеткам
Брыгадзір
Чацвертае брыгады,—
На нівах гэтых камандзір
І першы іх араты.
Спыніўся.
Цішыня кругом.
Кругом зямлі прасторы.
Ляжала каля ног яго
Зялёнай руні мора.
Маўкліва
Доўга ён стаяў.
З усмешкаю на твары,
Аб чымсьці думаў, разважаў
Ці можа проста марыў,
Успамінаў,
Як бараніў
Край ад чужой напасці,
Як на прасторах родных ніў
Сваё знайшоў ён шчасце.
А потым крочыў
Гаспадар
Паходкаю імклівай,
А след яго гарачых мар
Застаўся там, на ніве.

1947 г.

И. МУРАВЕЙКО

КАСКА

Когда опять вернусь, как в сказку,
В очаг далекий мой,
Осколком тронутую каску
Я принесу домой.
Её на детскую головку
Оденет мой сынок. —
Ну, что же, лучшую обновку
Я принести не мог...
Пусть он, согретый моей лаской,
Не знает того дня,
Когда его вот эта каска
Прикрыла, как броня.

1943 г.

Д. САСЕЎ

ЖНІВЕНЬ У „КОМУНАРЫ"

Да элеватара—шляхі:
З зярном адборным
Пяцідзёнку
Вазілі важкія мяхі
Штодзень тры новыя трохтонкі.
Бо тут спяшаліся зару
Сустрэць і сейбіт, і араты—
Яны ў пісьме правадыру
Далі святое слова—
Клятву.
І недарма
Пра «Комунар»
Далёка слава йдзе па свету.
Палі яго прынеслі дар —
Здзіўляюцца усе газеты.
...І жнівень не злічыў 'шчэ дзён—
За стол
Склікаць брыгады трэба:
Апошні малатарань звон
І свірны, гружаныя хлебам.

1947 г.

РАБОТА МАГІЛЕЎСКАЙ ФІЛІІ

У ліпені 1946 года была створана Магілеўская філія Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Да гэтага ў Магілеве працавала невялікая літаратурная група, якая аб'ядноўвала пераважна журналістаў і студэнцкую моладзь. Гэтая група не была звязана з літаратурнымі сіламі перыферыі, з мясцовымі культурнымі ўстановамі. Адсутнічала літаратурная вучоба.

Стварэнне філіі дало вельмі многае. Узнялася зацікаўленасць грамадскасці да работы пачынаючых пісьменнікаў. Новыя свежыя сілы—рабочыя з прадпрыемстваў, калгаснікі, прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі, людзі, якія любяць літаратуру і працуюць свае сілы ў ёй,—пацягнуліся да ўдзелу ў рабоце філіі.

Якую работу праводзіць філія?

Кожны тыдзень па чацверам праходзяць агульныя сборы філіі. На літаратурныя «чацверы» часта запрашаюцца выкладчыкі літаратуры сярэдніх школ і ВНУ, артысты абласнога тэатра, работнікі аддзелаў прапаганды абкома і гаркома комсамола.

У абвестку дня літаратурнага «чацвера» звычайна ўключаюцца два пытанні: лекцыя па тэорыі літаратуры і абмеркаванне твораў маладога пісьменніка. Лекцыі робяць самі члены філіі, або выкладчыкі мясцовага педагагічнага інстытута.

На літаратурных «чацверах» абмяркоўваліся фрагменты аповесці М. Ткачова, апавяданні П. Шасцерыкова, Я. Тарасава, Г. Волкава, «Партызанскія вапіскі» Дзярабіна, п'еса «З новымі сіламі» чыгуначніка Магілеўскага вузла А. Маліка і інш.

Абмяркоўваліся таксама вершы членаў філіі Н. Гарулёва, А. Пысіна, Э. Валасевіча, Д. Сасева і інш.

Усе члены філіі і таварышы, якія наведваюць літаратурныя «чацверы», актыўна ўдзельнічаюць у абмеркаванні твораў маладых пісьменнікаў. Кожны твор падвяргаецца крытычнаму разбору, робяцца заўвагі, даюцца таварыскія парады і ўказанні. Аўтар улічвае гэтую крытыку, дапрацоўвае твор і прыносіць яго на наступны літаратуры «чацвер». У філіі існуе правіла, што толькі твор, абмеркаваны на літаратурным «чацверу» і ўхвалены філіяй, рэкамендуецца для змяшчэння ў літаратурнай старонцы абласной газеты «За Радзіму».

Некалькі літаратурных «чацвераў» былі прысвечаны вывучэнню пастаноў ЦК ВКП(б) аб літаратуры, тэатры і кіно і даклада тав. Жданава аб часопісах «Звязда» і «Ленінград». Гэта вывучэнне прынесла вялікую карысць нашым маладым літаратарам.

Члены філіі актыўна ўдзельнічаюць у літаратурных старонках і старонках выхаднога дня, якія выдае абласная газета. Да ўдзелу ў літаратурных старонках і да асвятлення юбілейных літаратурных дат філія шырока прыцягвае выкладчыкаў літаратуры навучальных устаноў.

Члены філіі часта выступаюць з чыткай твораў па радыё. У час выбарчай кампаніі імі былі напісаны нарысы аб кандыдатах у дэпутаты, праводзіліся літаратурныя вечары на выбарчых участках.

Некалькі разоў філія арганізоўвала вечары на прадпрыемствах, у калгасах, у навучальных установах.

Штодзённа лістаносец прыносіць па некалькі пакетаў, адрасаваных Магілеўскай філіі. У гэтых пакетах—вершы, празаічныя творы таварышоў з перыферыі. Кожны аўтар атрымлівае адказ на свой ліст, неабходную кансультацыю. Акрамя таго, філія ўзяла шэфства над літаратурнай поштай абласной газеты. Найбольш здольныя таварышы з раёнаў вобласці выклікаюцца на «чацверы», на якіх абмяркоўваецца іх творчасць.

Філія падрыхтавала першы нумар абласнога літаратурнага альманаха. Акрамя таго мяркуецца сумесна з педінстытутам і абласным Домам народнай творчасці выдаць зборнік партызанскага фальклору (у філіі створана спецыяльная фальклорная секцыя).

Трэба адзначыць тую атмасферу ўвагі і дапамогі, якую аказвае нам Магілеўскі абком КП(б)Б.

Старэйшыя беларускія пісьменнікі, якія часамі наведваюць Магілеў, аказваюць філіі дапамогу. Але вельмі шкада, што гэтыя наведванні носяць выпадковы характар. Пажадана, каб было ўстаноўлена сталае таварыскае шэфства майстроў нашай літаратуры над літаратурнай моладдзю.

Я. ТАРАСАЎ.

У Брэсцкім літаратурным аб'яднанні

Адбыўся сход членаў літаратурнага аб'яднання пры брэсцкай абласной газеце «Зара». На сходзе абмеркавана інфармацыя М. Хрысціча аб рабоце аб'яднання.

За апошні час брэсцкія пісьменнікі напісалі рад новых твораў. Пётр Чарных закончыў першую частку аповесці «Пасля вайны», якая прысвечана паказу класавай барацьбы на вёсцы і перабудове сельскай гаспадаркі заходніх абласцей Беларусі. Зараз П. Чарных дапамагае Герою Совецкага Саюза В. Е. Чарнышову ў напісанні яго ўспамінаў аб партызанскай барацьбе. Члены аб'яднання Хрысціч і Жаваранкаў напісалі п'есы на матэрыяле пасляваеннага жыцця заходніх абласцей рэспублікі.

Абласны драматычны тэатр аказвае творчую дапамогу маладым драматургам і мяркуе ставіць гэтыя п'есы да 30-годдзя ВССР. Паэт Н. Чарняеў рыхтуе цыкл новых вершаў. Новыя творы закончылі члены аб'яднання М. Засім, Н. Сурская і інш. Нарыс аб калгасе імя Сталіна напісалі М. Хрысціч і П. Чарных.

На сходзе таксама выступілі сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б па прапагандзе тав. Луцкін і сакратар Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР П. Кавалёў.

Сход выбраў новы склад бюро літаб'яднання. Старшыня бюро—паэт Нікалай Чарняеў.

НА РОЗНЫМ УЗРОЎНІ

Ул. ШАХАВЕЦ.

Апавяданні Івана Грамовіча, сабраныя ў яго першым зборніку, які нядаўна выпушчаны Дзяржаўным выдавецтвам БССР*), прысвечаны людзям, якія ў грозных бітвах заваявалі перамогу і сёння сваёй мірнай працай замацоўваюць яе.

Першае, што звяртае на сябе ўвагу, калі пазнаёмішся са зборнікам,—гэта яго няроўнасць. Побач з добра напісанымі псіхалагічнымі апавяданнямі («Бацькава ўпэўненасць»), трапляюцца і такія, якім уласціва нарыснасць у горшым сэнсе гэтага слова («Вера Наваёнак»). Побач з апавяданнямі, дзе ўсе героі знаходзяцца на месцы, арганічна звязаны з сюжэтнай тканінай твора і служаць для выяўлення асноўнай думкі («Непрымірымасць») ёсць і такія, дзе некаторыя героі з'яўляюцца толькі давескам, ілюстрацыяй, якая штучна прыцягнута для падкрэслівання доблесці асноўнага героя («Молада-зелена», «У прымах»). Няроўнасць характэрна і для некаторых апавяданняў, узятых у паасобку. Дэталі, якія характарызуюць наглядальнасць аўтара і ўменне сказаць сваё слова, мяжуюцца з агульнымі рытарычнымі разважаннямі, з дэталямі, што павінны па задуме аўтара служыць займальнасці і ажыўленню героя, а на самой справе схематызуюць яго, або выстаўляюць у непрывабным святле.

Зборнік адкрываецца «Апавяданнем пра нястрымнае сэрца». У ім ёсць цікавыя нагляданні і замалёўкі. Вось, напрыклад, пачатак апавядання: «Мне давялося працаваць спецыяльным карэспандэнтам франтавой газеты. Праца гэта нагадвала, можна сказаць, пчалініую работу. Вернешся, бывала, у рэдакцыю, машыністка Насця перадрукуе дробныя, як дождж, радкі маіх нататак, потым вечарам наборшчык Васіль Барысенка набярэ іх у соты-гранкі, а раніцай мы ўжо каштуем мой «мёд», карэктыруем старонкі свежай газеты».

Аўтар стараецца прыкмеціць тыя асаблівасці ў паводзінах чалавека, якія накладваюць на яго прафесія лётчыка. У апавяданні пададзены і некаторыя рысы ў характары героя, што паказваюць яго як совецкага лётчыка. Але ў апавяданні адсутнічае характарыстыка лётчыка Гайваронскага як жывога чалавека, што мае свой уласны твар. Гэта адчуваў, напэўна, і сам аўтар, бо ў апавяданні ёсць спробы «ажывіць» героя. Толькі гэтыя спробы—няўдалыя, яны, замест таго, каб акрэсліць больш выразна мужную фігуру лётчыка і яго таварышоў, кідаюць на іх цень. «Ажыўленне» героя заключаецца ў тым, што яму прыпісваецца «бязбожная лаянка» і доўгія разважанні наконт таго, што на вайне без лаянкі абыйсціся нельга, што «кожнай рэчы павінна быць сваё імя». Нястрымнасць часамі блытаецца з простай недысцыплінаванасцю. Ён мала каго слухае. Што захоча, тое і зробіць... Нястрымны такі... «І ўжо ніяк нельга прабачыць аўтару безгустоўнасць і нават непрыстойнасць, калі ён падае непатрэбную для апавядання гісторыю ўцёка Гайваронскага са шпіталю, у якім ён быў пасля ранення ў «шчакатлівае месца».

У апавяданні ёсць такая «дэталь»: Гайваронскі, вяртаючыся на аэрадром з баявога вылету, у выпадку перамогі над ворагам «пікіруе на квасную будку», а сябры падрыхтоўваюць яму на белым прасцірадле «апазнавальныя знакі» ў выглядзе літра гарэлкі з закускай. Ці падумаў аўтар над тым, што падобныя «дэталі» скажаюць маральны воблік совецкіх лётчыкаў?

*) Іван Грамовіч, «Апавяданні», Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Мінск, 1947 год.

Для апавядання «Вера Наваёнак», якім заключаецца зборнік, у абмалёўцы вобраза схематызм характэрны яшчэ ў большай ступені, чым для «Апавядання пра нястрымнае сэрца». Аўтар імкнуўся намаляваць «дзяўчыну з характарам», але для гэтага не знайшоў патрэбных фарб і адпісаўся толькі агульнымі словамі. Апавяданне напісана холадна, і ўся «займальнасць» яго заключаецца ў тым, што асоба, ад імя якой вядзецца апавяданне, на працягу ўсёй размовы не ведае, што размаўляе з мужам Веры Наваёнак.

Ад імя аўтара вядуцца і яшчэ два апавяданні зборніка «Бацькава ўпэўненасць» і «Мой зямляк».

Калі для першых двух апавяданняў такая форма падачы матэрыяла толькі паглыбляе ўражанне аб іх спрошчанай нарыснасці, то пра «Бацькаву ўпэўненасць» гэтага сказаць нельга. Тут кожны ўчынак і рух герояў псіхалагічна апраўданы, знойдзены трапныя дэталі, а лішніх, якія не служаць задуме аўтара, няма. Бацькава ўпэўненасць у немагчымасці смерці свайго сына сімвалічна перарастае ва ўпэўненасць у неўміручасць справы, за якую ён змагаўся.

Апавяданне «Мой зямляк» значна псуецца надуманасцю сітуацыі. У бойцы з ворагам гіне старшына Васіль Трыян. На месца Трыяна, які загінуў, прысылаюць новага камандзіра аддзялення. Каб хутчэй зблізіцца з байцамі, што сумуюць па сваім ранейшым камандзіры, якога яны вельмі любілі, і насцярожана ставяцца да новага, ён аб'яўляе сябе сябром і земляком Трыяна. Байцы яму вераць, лічаць яго за блізкага чалавека. І, узяўшы «на сябе вялікі абавязак людскога давер'я», новы камандзір становіцца такім-жа, якім быў Трыян, губляе сваю палахлівасць, што выявіў ў першы-ж дзень з'яўлення на фронт. Надуманасць сітуацыі — відавочна.

Скупымі, але цёплымі словамі выпісаны ў гэтым апавяданні вобраз старэйшага яфрэйтара Аверына. З любоўю аўтар паставіўся і да старшыны Трыяна. У апавяданні ёсць добрасумленныя спробы аўтара разабрацца ў тым, што дае новаму камандзіру сілу для змагання з ворагам. Але ідэі і вывады не ў дастатковай ступені ўвасоблены ў мастацкія вобразы. Укладаючы свае думкі ў вусны герояў, аўтар збіваецца на рытарычнасць.

Апавяданне ад імя аўтара некалькі звужае яго магчымасці, патрабуе дадатковых намаганняў для абмалёўкі вобраза. Гэтае дадатковае І. Грамовіч знаходзіць не заўсёды. Ад імя аўтара напісана большасць апавяданняў зборніка. Акрамя таго, што гэта выклікае некаторую аднастайнасць, яно ў пералічаных апавяданнях—лішняе, арганічна не звязанае з творам, хіба за выключэннем «Апавядання пра нястрымнае сэрца». Сам апавядальнік амаль усюды адзін і той-жа, даўно знаёмы нам паводле твораў іншых аўтараў. Гэта—назойлівы, як муха, карэспандэнт, які здзіўляецца з кожнай дробязі і якога заўсёды бянтэжаць героі яго-ж уласнага апавядання.

У апавяданні «Молада-зелена» выяўляецца думка, што, знаходзячыся на любым пасту, можна прынесці карысць справе, калі толькі добрасумленна ставішся да сваіх абавязкаў.

«Сын батарэі» Лёнька Лазарчык, хаця ў некаторай ступені і падобны да іншых «сыноў» палка і другіх падраздзяленняў, але выпісаны з любоўю і павагай да героя.

Імкненне ўнікнуць барацьбы прыводзіць да здрадніцтва — такая думка апавядання «Непрымірымасць». Сымон Падаляк, у мінулым студэнт, а пазней настаўнік, клапоціцца толькі аб адным — аб выратаванні сваёй уласнай скуры. Ён адгадаваў сабе доўгую бараду, капаецца ў агародзе. Нібы «вельмі мудры піскар», «каб адчуць супакой і забыцца на ўсё на свеце, плюнуць і махнуць рукой на турботы, ён выкапаў у варывеньцы яму, паставіў шулы, абкідаў сцены, зрабіў патаемны ход і ў небяспечныя дні хаваўся сюды». Былы яго таварыш па вучобе Васіль Зарэвіч, які з першых-жа дзён вайны пайшоў у партызаны, да глыбіні душы абураецца такімі паводзінамі свайго былога таварыша і, адчуваючы свой абавязак перад Радзімай, бязлітасна распраўляецца з ім.

Цікавы змест апавядання «У прымах», бадай, самага лепшага ў зборніку. Іван Будніцкі дэмабілізуецца са шпіталя. Яго родная мясцовасць яшчэ акупіравана ворагам, ён застаецца працаваць у калгасе паблізу горада Кірава. Для яго з'яўляецца радзімай не толькі вёска, у якой ён нарадзіўся, але і ўся наша неабсяжная краіна. Стаўшы брыгадзірам калгаса, ён працуе з такой-жа добрасумленнасцю і энергіяй, як і раней у сваім родным калгасе, за тысячу кілометраў адгэтуль. І калі ён пазней адязджае дадому, яго новыя сябры збіраюць сход і абмяркоўваюць пытанне аб дапамозе разбуранаму калгасу на радзіме Івана Будніцкага. Дружба народаў, якая дапамагла перамагчы ў вайне, дапамагае і ў аднаўленні народнай гаспадаркі.

Апавяданні «Молада-зелена», «Непрымірымасць» і «У прымах» падобны паміж сабой. Гэтае падабенства заключаецца ў тым, што станоўчаму герою супроцьпастаўляецца адмоўны для таго, каб маральныя якасці першага акрэсліваліся больш выразна. Такі прыём кантраста зусім законны і можа быць паспяхова выкарыстаны пісьменнікам. У двух з названых апавяданняў («У прымах» і «Молада-зелена») аўтар гэтага не зрабіў — адмоўны герой з'яўляецца непатрэбным для выяўлення аўтарскай задумы і сюжэтна вельмі слаба звязаны з астатнімі героямі. Акрамя таго, зусім не зразумела, чаму разважанні і дзейнасць гэтых негатыўных герояў процілеглы разважанням і дзейнасці станоўчых герояў, хоць жывуць яны ў адным і тым-жа асяроддзі і робяць адну і тую-ж справу (іх папярэдняя біяграфія чытачу невядома).

Толькі ў апавяданні «Непрымірымасць» адмоўны герой знаходзіцца на месцы, арганічна звязаны з тканінай апавядання. Зразумела таксама, што прывяло яго да здрадніцтва, хаця прадгісторыя падаецца толькі ў некалькіх сказах.

Разгледзеўшы першы зборнік апавяданняў Івана Грамовіча, можна зрабіць такі вывад. Аўтарам закранаюцца патрэбныя і актуальныя тэмы. У апавяданнях падаюцца цікавыя і карысныя думкі. Аднак вартасць апавяданняў значна зніжаецца іх недахопамі. У адных выпадках яны выяўляюцца ў схематычнасці і «нарыснасці», у другіх—у абцяжарванні апавядання непатрэбнымі персанажамі, у адсутнасці матывіроўкі іх учынкаў і, нарэшце, — у не заўсёды ўмелым выкарыстанні дэталі. У зборніку ёсць апавяданні, якія сведчаць, што гэтыя недахопы могуць быць у далейшай рабоце пераадолены.

У Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР

31 студзеня адбылося першае творчае паседжанне секцыі перакладчыкаў. Разглядаліся пераклады вершаў П. Броўкі і М. Танка, зробленыя В. Мілаванавым, і пераклады вершаў П. Панчанкі, А Зарыцкага і А. Вялюгіна, зробленыя Ул. Варно.

У абмеркаванні перакладаў прынялі ўдзел Ул. Агіевіч, А. Зарыцкі, Ул. Карпаў, А. Вялюгін, Р. Няхай, А. Шарапаў і інш.

Выступаўшыя адзначылі, што з заслуханых перакладаў—большай дасканаласцю вылучаюцца пераклады Ул. Варно. Для работы перакладчыка характэрна яшчэ і тое, што ён для перакладаў падбірае творы, якія па сваіх стылявых асаблівасцях і па тэматыцы стаяць бліжэй да яго літаратурнага густу. Праўда, перакладчыку не заўсёды ўдаецца поўнасцю захаваць вобразныя сродкі твораў, якія ён перакладае.

У перакладах, зробленых В. Мілаванавым, часта губляюцца найбольш характэрныя для перакладаемых ім вершаў вобразы, губляюцца трапныя аўтарскія дэталі. Увогуле В. Мілаванаў мала працуе над вершамі, над перадачай моўных асаблівасцяў аўтараў.

* * *

31 студзеня для пісьменнікаў Мінска Г. Бярозкін прачытаў лекцыю аб заняпадзе і разлажэнні літаратуры і тэатральнага мастацтва захада.

Рост кніжнага фонда бібліятэк

З кожным годам расце кніжны фонд масавых бібліятэк рэспублікі. У сучасны момант у 336 бібліятэках налічваецца звыш 5 мільёнаў тамоў кніг.

Кніжны фонд Дзяржаўнай бібліятэкі імя В. І. Леніна ў Мінску пераўзыйшоў даваенны ўзровень. Ён дасягае ўжо двух мільёнаў 800 тысяч тамоў кніг. У масавых бібліятэках Віцебскай вобласці налічваецца 202.450 кніг і ў хатах-чытальнях 140.205 кніг.

Толькі праз бібліятэчны калектар Камітэта па справах культурна-асветных устаноў пры Совеце Міністраў БССР у 1947 годзе ў масавыя бібліятэкі рэспублікі накіравана палітычнай, мастацкай, сельскагаспадарчай і тэхнічнай літаратуры на 4,5 мільёна рублёў.

МАСАВАЯ РАБОТА З ЧЫТАЧАМІ

Палеская абласная бібліятэка (дырэктар тав. Мельнічонак) сістэматычна праводзіць масавую работу з чытачамі. У дні адпачынку ў чытальнай залі бібліятэкі праводзяцца лекцыі, гутаркі, літаратурныя вечары і канферэнцыі чытачоў.

Нядаўна адбылася канферэнцыя чытачоў па кнізе Б. Палявога «Аповесць аб сапраўдным чалавеку».

За апошні час праведзены тры літаратурныя вечары на тэмы: «Шлях совецкай літаратуры за 30 год», «Беларуская совецкая літаратура», «Вялікі пісьменнік Л. Н. Талстой».

Новыя дамы культуры

Паводле рашэння Совета Міністраў БССР у гэтым годзе ў Пінскай, Брэсцкай, Баранавіцкай, Маладзечненскай, Гродзенскай і Полацкай абласцях намечана адкрыццё 192 новых Дамоў культуры.

У радзе раёнаў Маладзечненскай і Баранавіцкай абласцей пачаліся ўжо будаўнічыя работы.

Ю. Г. РУДЗЬКО

Пасля доўгай і цяжкай хваробы, 4 лютага 1948 года, памёр Юры Герасімавіч Рудзько — малады, таленавіты беларускі пісьменнік.

Усё сваё свядомае жыццё Ю. Г. Рудзько аддаў на карысць нашай Радзімы, справе вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Ю. Г. Рудзько нарадзіўся ў 1913 годзе. У 1929 годзе, пасля сканчэння сярэдняй школы, ён працуе настаўнікам у пачатковай школе в. Старцэвічы (Слуцкі раён). Затым ён паступае ў Мінскі педагагічны інстытут. Будучы студэнтам, Ю. Рудзько пачынае пісаць нарысы і апавяданні аб калектывізацыі вёскі, аб нашай моладзі і новабудоўлях першай сталінскай пяцігодкі.

З 1933 года і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён працуе ў рэдакцыі газет «Чырвоная Змена», «Літаратура і мастацтва», выступаючы з крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі па актуальных пытаннях літаратурнага і тэатральнага жыцця. У 1940 годзе яго п'еса «Канец маскарада», прысвечаная выкрыццю дзейнасці класава-варожых элементаў на вёсцы, была пастаўлена Барысаўскім калгасным тэатрам.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны і да дня перамогі над гітлераўскай Германіяй Ю. Г. Рудзько служыў у радах Совецкай Арміі і прымаў непасрэдны ўдзел у баях за нашу соцыялістычную бацькаўшчыну.

Урад высока ацаніў заслугі Ю. Г. Рудзько перад Радзімай і ўзнагародзіў яго ордэнам Айчыннай вайны II-ой ступені, двумя ардэнамі «Чырвонай Звязды», мядалямі «За абарону Масквы» і «За перамогу над Германіяй».

Пасля дэмабілізацыі Ю. Рудзько поўнасцю аддаецца літаратурнай працы. Ім напісаны п'есы «Дарагі госць»—аб перадавых людзях калгаса, — прэміраваная на Усебеларускім конкурсе і прынятая да пастаноўкі тэатрам імя Я. Купалы, аповесць «Пястаўская зямля» і п'еса «Слава дружбе», прысвечаны баявому сяброўству славянскіх народаў, а таксама цікавыя апавяданні аб слаўных воінах Совецкай Арміі і аб аднаўленні калгаснай вёскі.

У росквіце творчых сіл смерць спыніла літаратурную дзейнасць пісьменніка—комуніста Ю. Рудзько.

Яго светлы вобраз будзе доўга жыць у нашых сэрцах.

М. Іаўчук, Якуб Колас, А. Эльман, Н. Красоўскі, П. Лютаровіч, П. Броўка, М. Лынькоў, К. Крапіва, А. Куляшоў, І. Гутараў, П. Глебка, М. Танк, М. Клімковіч, Я. Маўр, І. Гурскі, П. Панчанка, В. Вольскі, П. Пестрак, П. Кавалёў, М. Горцаў, С. Майхровіч, У. Стэльмах, Г. Глебаў, Л. Літвінаў, К. Саннікаў, А. Стаховіч, Ц. Крысько, А. Астрэйка, А. Есакоў, У. Няфёд, В. Барысенка, М. Модэль, М. Калачынскі, Я. Рамановіч, А. Кучар, У. Краўчанка, А. Кулакоўскі, А. Бурдзель, І. Мележ, І. Грамовіч, Ф. Алер.

Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці пісьменніка-драматурга ЮРЫЯ ГЕРАСІМАВІЧА РУДЗЬКО.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці пасля працяглай і цяжкай хваробы пісьменніка Юрыя Герасімавіча РУДЗЬКО і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.

Каляктыў Беларускага Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра імя Янкі Купалы з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці таленавітага драматурга Юрыя РУДЗЬКО, якая паследвала ў выніку цяжкай хваробы 4 лютага гэтага года, і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.

Апошні шлях

6-га лютага літаратурная і тэатральная грамадскасць Мінска праводзіла ў апошні шлях комуніста-пісьменніка Юрыя Рудзько.

У тэатр імя Янкі Купалы, дзе была ўстаноўлена труна з нябожчыкам, прышлі развітацца пісьменнікі, артысты, сябры і родзічы.

Гучаць жалобныя мелодыі марша. На пастаменце, устаноўленым на сцэне, у кветках і траўрных палотнішчах патанае труна. На пярэднім плане вянкі ад Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі, Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР, Беларускага Дзяржаўнага тэатра імя Янкі Купалы і інш.

У памяшканні тэатра імя Янкі Купалы адбылася грамадзянская паніхіда. Паніхіду адкрыў пісьменнік М. Лынькоў. Ён сказаў:

— У асобе Рудзько беларуская літаратура страціла здольнага пісьменніка. Ён толькі пачынаў распраўляць свае крыллі, поўны быў творчых планаў, спяшаўся сказаць сваё слова аб багатым жыцці, аб выдатных людзях, аб тых вялікіх зрухах, якія адбываюцца вакол нас.

Галоўны сакратар Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі П. Броўка гаворыць:

— Мы памятаем Рудзько, як сціплага чалавека і пісьменніка, які заўсёды адклікаўся на сучасныя падзеі. Ён любіў сваю радзіму, абараняў яе ад ворага як салдат і разам з тым пісаў патрыятычныя творы.

З развітальнымі прамовамі выступілі Ул. Стэльмах, Ц. Крысько.

На могілках ад імя Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі выступіў І. Гурскі.

Н. НЕЎСКАЯ

ДРАМАТУРГІЯ БРАДВЕЯ

Наступленне рэакцыі, якое назіраецца цяпер ва ўсіх галінах унутранай і знешняй палітыкі ЗША, не абыйшло і мастацтва.

Мы бачым, як канчаткова скідаюцца нешматлікія фігавыя лісточкі лібералізма. Ваяўнічая рэакцыя становіцца за дырыжорскі пульт, без усялякага сораму ўздымаючы ў руцэ дубіну далара.

Законы тэатральнага жыцця Амерыкі дыктуюцца касавымі поспехамі. Шлях амерыканскага тэатра паказваюць антрэпрэнёры і дзялкі з Брадвея.

Вядомы амерыканскі тэатральны крытык Розамунд Гільдэр указвае незвычайна вялікую колькасць камедый і музычных п'ес, якія ставіліся ў гады вайны і працягваюць сваё шэсце па тэатрах у перыяд міру.

З 36 п'ес, якія займалі ў мінулым сезоне найбольш трывалае месца ў рэпертуары нью-йоркскіх тэатраў — 24 п'есы лёгкага жанру і дэтэктыўныя меладрамы, 4 класічныя і толькі 4 сучасныя, так званыя «праблемныя» п'есы.

У гады вайны Брадвей быў цэнтрам эскапісцкай («Эскап»—бегства—у дадзеным выпадку—бегства ад рэчаіснасці) драматургіі. Кіраўнікі тэатральнага жыцця Амерыкі сцвярджалі, што глядач шукае ў тэатры сродку, каб апынуцца ў свеце ілюзій, дзе нішто не напамінала-б аб навакольным жыцці. Рэвю, агляды панавалі на Брадвеі — і тэатр адгукаўся на найвялікшыя сусветныя падзеі вельмі своеасабліва, устаўляючы ў рэвю патрыятычныя сказы пад заслону ці ўключаючы ў рэпертуар такія псеўда-ваенныя вадэвілі, як «Ваенныя дзяўчаты» Джазэфа Фільда (гісторыя трох дзяўчат, якія імкнуцца выйсці замуж у час вайны), ці «Дарагая Руф» Норман Красна (кранальная гісторыя дзяўчынкі-падростка, якая перапісваецца пад імем сваёй старэйшай сястры з франтавіком, што лічыць яе сваёй нявестай).

Закон аб апалітычнасці амерыканскага тэатра працягвае захоўваць сваю сілу і пасля вайны. Рэкламныя агні Брадвея паведамляюць гледачу аб вясёлай камедыі «О, мая пані», дзе ён можа ўбачыць гісторыю міністра яго марганітычнай жонкі і яе сына ад першага шлюбу, які пакутуе, што маці не абвенчана з панам міністрам, ці аб несыходзячай з рэпертуара апошніх год камедыі «Голас горліцы», дзе смакуюцца пікантныя прыгоды дзвюх маладых амерыканак, што абменьваюцца каханкамі.

Імкненне да падкрэсленага эратызму, сексуальнасці характэрна для амерыканскай драматургіі. На адной з нарад кіраўнікоў амерыканскай кінопрамысловасці магнат кінематаграфіі Цукер скардзіўся, што кіно, у асноўным, наведвае моладзь. Дарослыя гледачы аддаюць перавагу тэатру. Прычыну гэтага Цукер бачыць у строгасці амерыканскай цэнзуры, якая не дазваляе кінопрамысловасці ставіць «вострыя» рэчы. Значна лепш, паводле думкі Цукера, выглядае справа ў тэатры, дзе глядач можа ўбачыць прадстаўленні (накшталт папулярнай п'есы Кесельрынга «Мыш'як і старыя карункі»), якія ўзбуджаюць, казычуць нервы.

Патаемныя лесвіцы, маніякальныя забойцы, дзеці, што нявінна пакутуюць, і іншыя меладраматычныя аксесуары фігурыруюць у меладраме Р. Тэрну «Патаемны пакой». Свет гангстэраў паказаны ў баявіку Брадвея «Жабракі прыходзяць у горад» Тэадора Рыуса, «Незнаёмец»—Леслі Рыд і інш.

У вялікай модзе так званыя «фантомы»—п'есы з удзелам духаў. Прывіды з'яўляюцца галоўнымі дзейнымі асобамі і самым энергічным чынам умешваюцца ў справы жывых людзей. Аўтары з захапленнем паказваюць, як сем прывідаў парашутыстаў, якія загінулі, вяртаюцца дахаты да сваіх жонак («Палёт у небе» Клейнера); як дух пахаванага бацькі, што пакінуў сваю сям'ю ў цяжкім матэрыяльным становішчы, умешваецца ў заблытаныя фінансавыя справы сям'і. Пры дапамозе духа — вясёлага, жыццерадаснага прывіду, здань імкнецца палегчыць становішча сваіх блізкіх («Не даруйце» Дж. Сіттон); нейкі муж атручвае сваіх жонак замест таго, каб разводзіцца з імі («Дзве міс Кероль» М. Вель, англійская меладрама). Драматург Артур Лоурэнс у артыкуле, змешчаным у «Нью-Йорк Таймс», усклікае: «Дзе ў нас п'есы, якія займаюцца асновамі чалавечых паводзін, п'есы, героі якіх людзі, а не сцэнічныя персанажы, п'есы, якія спрабавалі хоць-бы на долю дзюйма пранікнуць у глыб рэчаў? Дзе яны?»

Калі ў рэпертуар тэатраў Брадвея ўключаюцца «праблемныя» п'есы, дык можна быць упэўненым, што яны служаць справе рэакцыі. Прыкладам гэтага можа быць творчасць аднаго з найбольш модных драматургаў Амерыкі Торнтона Уайльдэра, наскрозь прасякнутая змрочным, безвыходным песімізмам. У п'есе «На валаску ад смерці» радавы амерыканец Антрабус са сваёй сям'ей (ён-жа старажытны Адам) перажывае наступ ільдоў на зямлю і патоп (пад гэтымі прыроднымі катаклізмамі разумеецца сусветная вайна). Цывілізацыя гіне і нараджаецца зноў. Антрабус занава вынаходзіць азбуку і табліцу множання. Носьбіт зла ў п'есе сын Антрабуса — Генры (ён-жа і Каін) у імя свабоды кідае выклік свайму бацьку. Адам Антрабус клянецца змагацца з гэтым парушальнікам сусветнага парадку. Такім чынам, аўтар сцвярджае, што свет неаднаразова перажываў найвялікшыя катастрофы, але ўсё ўладкоўвалася само сабой. Усё, што было, будзе зноў і няма патрэбы ўмешвацца ў ход гісторыі.

П'еса Уайльдэра «Наш горад», прызнаная амерыканскай крытыкай найвялікшай п'есай нашага часу («Нью-Йорк Морнінг Тэлеграф»), апавядае аб штодзённым жыцці радавых людзей у невялікім амерыканскім горадзе. Адна з дзейных асоб—рэдактар Уэб гаворыць: «Гэта самы звычайны, радавы горад. Магчыма больш сумны, чым іншыя, але наша моладзь любіць яго і 90 процантаў з іх пасля сканчэння школы застаюцца тут жыць. У яе, вядома, мала таго, што лічыцца высокай культурай. Мы ведаем Рабінзона Крузо ды біблію, вось і ўсё...» Героі п'есы цікавяцца соцыяльнымі пытаннямі, яны шукаюць шляхі, каб людзі працавітыя і разумныя маглі ўзнімацца ўверх а гультаяватыя і надакучлівыя — зыйсці на нішто». Але ўсе намаганні і імкненні маленькіх людзей Амерыкі гінуць марна.

Творы Уайльдэра, у ідэйным падтэксце якіх, па сутнасці, няма нічога новага, успрыймаюцца ў Амерыцы як апошняе слова ў драматургіі. Хрысціянская мараль і піфагарэйская філасофія Уайльдэра абвяшчаюцца найвялікшымі дасягненнямі. «Нью-Йорк Таймс», а за ім і ўвесь друк Амерыкі сцвярджаюць, што Уайльдэр «пераўвасабляе чалавечае жыццё ў суветную мару».

Тым-жа беззыходным песімізмам поўняцца творы іншых драматургаў, якія пішуць так званыя сур'ёзныя п'есы,—усе яны гавораць аб бессэнсоўнасці чалавечага існавання, аб неабходнасці схавацца ад рэальнага свету ў свет фантазій і ілюзій, няхай сабе назат хваравітых, ненармальных. Мара — гэта наркотык для амерыканскай інтэлігенцыі, якая не бачыць выхаду са змрочнай рэчаіснасці.

У п'есе Тэнесі Вільямса «Шкляны звярынец» паказаны дробны чыноўнік Том, які пасля нуднай працы, што атручвае душу, шукае забыцця ў кіно, адурманьваючы сябе салодкімі нерэальнымі марамі. Яго сястра Лора — калека, яна таксама жыве ў выдуманым свеце і дзеліцца сваімі думкамі толькі з калекцыяй шкляных звяроў. Жыццё разбурае ілюзіі маладых людзей, і аўтар не ўказвае ім ніякага выхаду, сцвярджаючы абавязковасць расчаравання і незавершаных імкненняў у сучасным свеце.

Уцёкі ад рэчаіснасці — любімая тэма драматургаў Амерыкі. Мы сустракаемся з ёй і ў папулярнай п'есе Мэры Гейз «Гарвей», у якой лятуценнік і алкаголік знаходзіць суцяшэнне ад цягот жыцця ў сяброўстве з чарговым прывідам—выдуманым ім белым трусам з даўгімі шаўкавістымі вушамі, з якім ён вядзе працяглыя філасофскія размовы, і ў п'есе Тэнесі Вільямс і Данальда Віндзел «Вы кранулі мяне», дзе апавядаецца, як стары марак і яго сям'я імкнуцца пражыць астатак свайго жыцця ў свеце ўспамінаў, імкнуцца як мага больш ізалявацца ад рэчаіснасці.

Надзвычай характэрным для стану амерыканскай драматургіі з'яўляецца той факт, што такія аўтары, як О'Нэйль, Кліффорд Одэтс, Сідней Кінгслі, Эльмерс Райс, што пісалі ў мінулым п'есы, не пазбаўленыя вострага соцыяльнага гучання, цяпер ці маўчаць ці ўпадаюць у агульны тон песімізма і скепсіса.

Факты, якія сведчаць аб дэградацыі і маральнай дэградацыі амерыканскай драматургіі, шматлікія, але несумненна таксама, што ў мастацтве Амерыкі ёсць людзі, гатовыя супраціўляцца наступленню рэакцыі.

Ужо ў час вайны Тос Харт і Максуэл Андэрсан імкнуліся паказаць салдат амерыканскай арміі, іх гераічныя подзвігі і патрыятызм («Крыллі перамогі»), «Баявая аперацыя»). Тэме маральна-палітычнага разгрому фашызма былі прысвечаны п'есы Ліліян Хелман («Свежы вецер») і Ходарава («Рашэнне»).

За апошні час з'явілася некалькі п'ес, у якіх закранаюцца ў той ці іншай меры значныя пытанні сучаснасці. Акрамя п'есы Гоу і Д'Юсо «Глыбокія карэнні», пастаўленай у радзе нашых тэатраў, ёсць яшчэ некалькі спроб асвятліць пытанне аб расавай дыскрымінацыі ў Амерыцы. Грамадская сістэма, пры якой негр—гэта бяспраўная істота, што не мае права па жыццё і на працу, ярка паказана ў п'есах «Джэб» Ардрэй і «Дзіўны плод» Ліліян Сміт.

Фігуры амерыканцаў-цынікаў і дзялкоў, поўных знявагі да ідэй гуманізма, мы знаходзім у п'есах Бермана—«Дачка» і Каніна—«Народжаная ўчора».

Але ўсе гэтыя асобныя спробы не знаходзяць падтрымкі ў амерыканскай крытыцы і ў дзялкоў Брадвея; п'еса Харта і Андэрсана нядоўга пратрымалася ў рэпертуары. Нью-йоркскія тэатры не рызыкнулі паставіць «Рашэнне» Ходарава, і аўтару давялося самому фінансаваць пастаноўку. Пасля некалькіх прадстаўленняў былі зняты п'еса Мілера і п'еса «На вуліцы белых» Т. Вуд, прысвечаныя праблеме расавай дыскрымінацыі.

Прыхільнікі прагрэса і сапраўднай дэмакратыі ў ЗША спрабуюць гаварыць свайму народу праўду аб важнейшых праблемах сучаснасці, але ўсе гэтыя парасткі новага падаўляюцца рэакцыянерамі, якія маюць самы рашучы ўплыў на мастацтва Амерыкі.

Беглы агляд сучаснай драматургіі ЗША паказвае, што амерыканскі тэатр уступіў у перыяд відавочнага крызіса, які ўсё больш і больш абвастраецца. Гэты крызіс звязаны з глыбокім крызісам буржуазнай культуры.

На сцэну не пападаюць п'есы са значнымі прагрэсіўнымі ідэямі аб барацьбе за дэмакратыю, за папярэджанне новых войн за лепшыя соцыяльныя ўмовы, п'есы, якія выступаюць супроць расавай дыскрымінацыі і пагрозы крызіса.

Амерыканская рэакцыя ў ліку сваіх іншых ідэалагічных манеўраў выкарыстоўвае мастацтва тэатра. Яна імкнецца адцягнуць увагу народа, чым толькі можна, пачынаючы ад сусветных «ідэй» Уайльдэра, О'Нейля і іншых бульварных меладрам з гангстэрамі, зданямі і пышнымі забаўляльнымі рэвю.

Будучыня пакажа, ці ўдасца амерыканскім драматургам выйсці з гэтага цяжкага творчага тупіка, ці ўдасца амерыканскаму тэатру стаць сапраўдным мастацтвам, якое праўдзіва раскрывае перад сваім народам хвалюючыя пытанні сучаснасці.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.
Рэдкалегія: П. ПАНЧАНКА, А. КУЧАР (нам. рэдактара), М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, М. КАЦАР, К. САННІКАЎ, П. ПАДКАВЫРАЎ, М. БЛІСЦІНАЎ.

АТ 02260 Адрас рэдакцыі: Рэвалюцыйная, 3. Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэвалюцыйная, 12.